ВАЛАНЦЁР СЯРЭБРАНАГА ВЕКУ

ПА СЛЯДАХ ВІЦЕБСКАГА ГУЛІВЕРА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

3 ЖНІЎНЯ 2022 г.
СЕРАДА
№ 150 (29772)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ЛІЧБА ДНЯ

1 млн 85 тысяч

вучняў, у тым ліку 115 тысяч першакласнікаў, пачнуць навучальныя заняткі ў краіне з 1 верасня, паведаміла прэс-служба Міністэрства адукацыі. У 2022/2023 навучальным годзе будуць функцыянаваць 2866 устаноў дашкольнай адукацыі, 2901 дзяржаўная ўстанова адукацыі, якая рэалізоўвае адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі. У ведамстве падкрэслілі, што падрыхтоўка ўстаноў дашкольнай, агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі да пачатку навучальнага года ажыццяўляецца планамерна.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ТРЭБА НАВОДЗІЦЬ ПАРАДАК ТАМ, ДЗЕ ЯГО НЯМА. ГЭТА БУДУЧЫНЯ НЕ ТОЛЬКІ МЯДЗЕЛЬСКАГА РАЁНА, АЛЕ І КРАІНЫ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка з рабочым візітам наведаў Мядзельскі раён. Гэта чарговая рэгіянальная камандзіроўка кіраўніка дзяржавы, у цэнтры якой пытанні ўборачнай кампаніі і развіцця сельскагаспадарчай сферы ў цэлым.

Фота БелТА.

Беларускі лідар наведаў сельскагаспадарчы філіял ААТ «Мінскаблаграсэрвіс», дзе яму далажылі аб ходзе ўборачнай кампаніі ў рэгіёне і ў краіне. Аляксандр Лукашэнка пазнаёміўся з пілотным праектам па стварэнні эфектыўнай сельскагаспадарчай арганізацыі з нуля. Сельскагаспадарчы філіял ААТ «Мінскаблаграсэрвіс» створаны 22 лістапада 2021 года. Для гэтага былі выдзелены ўгоддзі сельскагаспадарчых арганізацый Мядзельскага раёна, якія неэфектыўна працавалі. Цяпер плошча сельгасугоддзяў складае 8,8 тысячы га, у тым ліку ворных зямель — 4,3 тысячы га, у далейшым плошча будзе павялічвацца. Асноўны напрамак дзейнасці — вытворчасць прадукцыі раслінаводства з далейшым забеспячэннем птушкагадоўчых фабрык і свінагадоўчых комплексаў Мінскай вобласці збожжам.

Прэзідэнт падкрэсліў, што канкрэтна гэтая гаспадарка — узор для стварэння падобных гаспадарак, дзе з улікам сучасных падыходаў створаны неабходныя аб'екты, сярод якіх і добры мехдвор для захоўвання і абслугоўвання энерганасычанай тэхнікі, зернесушыльны комплекс.

Гаспадарка з нуля

Генеральны дырэктар ААТ «Мінскаблагрэсэрвіс» Дзмітрый Шабар расказаў, што было зроблена канкрэтна на мехдвары. Чатыры старыя будынкі прыбралі, чатыры рэканструявалі. Кіраўнік гаспадаркі расказаў, што ў ёй дастатко-ва складаныя палявыя работы, працуюць і з ворнымі землямі, і тымі, якія на працягу некалькіх гадоў не выкарыстоўваліся. Побач — зернесушыльны комплекс і сховішча. Для Беларусі такія комплексы неабходныя, каб дасушыць сабранае збожжа і закласці на захоўванне.

СТАР. 2

КАРОТКА

• Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава наведала фермерскі рынак «Валяр'янава».

• **Жніво з камфортам: у СВК імя І. П. Сянько Гродзенскага раёна распрацавалі свой варыянт спецадзення.**

• У крамах Віцебска правялі маніторынг цэн на школьныя тавары.

• **Каля 71 працэнта жылых дамоў у Мінскай вобласці да 2025 года будуць даступны для інвалідаў.**

• У Маларыцкім раёне мужчына пасля ўкусаў пчол памёр ад анафілактычнага шоку.

• **Беларускія сінхраністкі выйгралі пяць медалёў у апошні дзень «Гульняў Дружбы».**

Добрая навіна

У ДОБРУШЫ АДКРЫЛІ СПАРТКОМПЛЕКС

Доўгачаканы падарунак гэтымі днямі атрымалі жыхары Добруша. У райцэнтры пасля рэканструкцыі, а па сутнасці, поўнага абнаўлення адкрылі спартыўны комплекс «Юнацтва».

Сучасная спартыўная інфраструктура — на радасць не толькі спартсменам, трэнерам, але і ўсім гараджанам — аматарам актыўнага адпачынку і здаровага спосабу жыцця. Комплекс пасля рэканструкцыі — адміністрацыйна-бытавыя будынкі для спартсменаў і трэнерскага, інструктарскага саставаў, сектары для скачкоў у даўжыню і вышыню, штурхання ядра, новыя бегавыя дарожкі. З'явілася новая гульнявая пляцоўка для баскетбола і валейбола, а таксама хакейная каробка. Акрамя таго, стадыён абсталяваны пляцоўкай з вулічнымі трэнажорамі і зонай для заняткаў варкаўтам. Але галоўная «фішка» добрушскага «Юнацтва» — поўнаразмернае, з сучасным штучным пакрыццём футбольнае поле, якое адпавядае заяўленым стандартам Міжнароднай федэрацыі футбола.

СТАР. 3

Экалогія

МАНІТОРЫНГ ПАВЕТРА, ВАДЫ І ЗЯМЛІ

Што робіцца для паляпшэння экалагічнай сітуацыі ў сталіцы

Павелічэнне выкарыстання электробусаў, працяг будаўніцтва трэцяй лініі метро, стварэнне электразарадных станцый і веладарожак, выдзяленне палос для грамадскага транспарту і развіццё маршрутнай сеткі наземнага гарадскога электрычнага пасажырскага транспарту павінны паспрыяць Беларусі рухацца да вугляроднай нейтральнасці. А каб стымуляваць насельніцтва да раздзельнага збору адходаў, варта ўстанавіць на іх два тарыфы. Адзін (вельмі высокі) — на захаванне адходаў, — каб жыхарам было нявыгадна захоўваць іх. Другі (меншы) — на паслугу па абарачэнні з другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі (ДМР). Калі ў кантэйнерах для ДМР смецця акажацца больш — насельніцтва заплаціць менш. Пра сістэму раздзельнага збору смецця і абарачэнне з адходамі, а таксама маніторынг якасці сталічных паветра, рачной вады і шкодных выкідаў прадпрыемстваў расказалі эксперты.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

«ТРЭБА НАВОДЗІЦЬ ПАРАДАК ТАМ, ДЗЕ ЯГО НЯМА. ГЭТА БУДУЧЫНЯ НЕ ТОЛЬКІ МЯДЗЕЛЬСКАГА РАЁНА, АЛЕ І КРАІНЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Збожжавыя ў нас, вядома, не так, як на Кубані або на поўдні Украіны. Яны не высушваюцца на полі. Таму іх трэба дапрацоўваць», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

«Зернесушылку сам накідаў, як я яе бачу. Паездзіў па краіне, паглядзеў, якія комплексы ёсць у гаспадарках, крыху яе дапрацаваў. З «Амкадорам» паклалі на паперу, спраектавалі, пабудавалі. Асаблівасць сушылкі ў тым, што ў ёй сумешчаны магчымасці як для папярэдняй апрацоўкі, так і для працяглага захоўвання. Гэта дазваляе прывезенае з поля збожжа не захоўваць проста на зямлі, няхай гэта будзе нават асфальтавае ці бетоннае пакрыццё, а суткі захоўваць у спецыяльным месцы ў чаканні дапрацоўкі», — расказаў кіраўнік гаспадаркі.

Уся інфраструктура гаспадаркі з'яўляецца асновай для мяса-малочнай вытворчасці і жывёлагадоўлі ў цэлым. І хоць частка ўжо мадэрнізаваная, работы яшчэ шмат. Гэтая гаспадарка была створана фактычна з нуля за кошт аб'яднання сельгасугоддзяў, якія раней неэфектыўна выкарыстоўваліся. «Гэта ўзор стварэння новых гаспадарак: машынны двор, які павінен быць, зернесушылка, якая павінна быць, і малочнатварная ферма. Гэтая гаспадарка павінна быць больш арыентавана, напэўна, усё ж такі на малочную жывёлагадоўлю і адкорм. Калі вы і птушку ды свініну будзеце яшчэ недзе вырабляць, гэта ўжо ваша справа», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён асобна звярнуў увагу на важнасць уключэння ў абарот кінутых зямель, якія не выкарыстоўваюцца, удасканалення інфраструктуры ад старых малых гаспадарак, на базе якіх неабходна стварацьновыя буйныя гаспадаркі. Гэта задача не толькі для Мядзельскага раёна і больш паўночных тэрыторый Віцебскай вобласці, але і для краіны ў цэлым. Аляксандр Лукашэнка параіў такім гаспадаркам арыентавацца на вопыт агракамбіната «Дзяржынскі» па комплексным развіцці вытворчасці, забеспячэнні ўласных патрэбнасцяў у кармах. «На пачатковым этапе — 6-7 гаспадарак — для Мядзела больш не трэба. А потым, можа, ты паглынеш увесь Мядзельскі раён», — заўважыў ён.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў свой час у рамках мадэрнізацыі вёскі больш увагі ўдзялялі развіццю аграгарадкоў, сацыяльнай сферы: «Мы разумелі, што трэба людзям умовы стварыць. ***Мы кінуліся ў аграгарадкі, устанавілі стандарты, пачалі адраджаць вёску. І крыху захапіліся сацыяльнай базай. Атрымаўся перакос. Таму цяпер робім упор на матэрыяльную базу для таго, каб людзі маглі працаваць. Работа — гэта зарплата. Тады можна і аграгарадок у парадак прывозіць, і людзі будуць жыць у гэтым аграгарадку. Момант цяпер уздыму матэрыяльнай базы.*** Вось у чым задума і мэта майго прыезду», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт упэўнены, што трэба, хоць гэта і нятанна, на базе старых і неэфектыўных гаспадарак, уцягваючы землі, якія не выкарыстоўваюцца, стварацьтакія новыя сельгаспрадпрыемствы: «Трэба ісці ў гэтым напрамку і наводзіць парадак там, дзе яго няма. Гэта будучыня не толькі Мядзельскага раёна, але і краіны». Ён акцэнтаваў важнасць Мінскай вобласці для развіцця краіны ў цэлым: сельгасвытворчасць у рэгіёне важна давесці да высокага ўзроўню. Прэзідэнт парэкамендаваў наведаць малочнатаварны комплекс у Слуцкім раёне, куды ездзіў на мінулым тыдні. Ён назваў яго ўзорам стварэння малочнатаварнага комплексу.

«Вось развіццё сельскай гаспадаркі. Гэта наш шлях», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

«Не чакайце надвор'я!»

Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар Брыло далажыў Прэзідэнту, што ўборачная кампанія ідзе нармальнымі тэмпамі. На раніцу 2 жніўня намалочана 1 млн 774 тысячы тон збожжа, што складае каля 22 працэнтаў. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся дэталямі гэтай кампаніі, не пакінуў без увагі ўборку ў тым ліку азімага рапсу і грэчкі. Асобна беларускі лідар засяродзіўся на ўборцы льну. Ён расказаў, што кітайцы гатовыя ў нас купляць ільняное валакно ў вялікай колькасці. Пра гэта кіраўніку дзяржавы паведаміў пасол Беларусі ў Кітаі Юрый Сянько на нядаўняй сустрэчы. «Да тэмы вырошчвання льну мы яшчэ вернемся, і трэба па максімуме ў гэтым напрамку працаваць. Восенню паглядзім ураджай на Аршанскім ільнокамбінаце», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што сёлета ўмовы надвор'я абсалютна спрыяльныя для ўборкі. «Надвор'я не чакайце, надвор'е ідэальнае. Поўдзень ужо да паловы падабраўся. Манеўраваць! Забыцца на мінулыя сухія гады! Надвор'е — падарунак, трэба проста разумна падыходзіць да ўборкі, тактыку выпрацаваць», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да Ігара Брыло.

Прэзідэнт запатрабаваў ад сельскагаспадарчай галіны поўнага забеспячэння ўнутранага рынку прадуктамі харчавання. А абмяркоўваючы пытанні экспарту сельгаспрадукцыі, асобна спыніўся на тым, што экспарт не павінен агаліць унутраны рынак. Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар Брыло запэўніў — праблем з унутраным рынкам не будзе.

***

Таксама Аляксандр Лукашэнка адказаў на актуальныя пытанні, якія задалі яму журналісты.

«Мы павінны накарміць сваіх людзей»

У прыватнасці, кіраўнік дзяржавы растлумачыў, чаму Беларусь не будзе экспартаваць збожжа. Паводле яго слоў, важна за кошт збожжа атрымаць прадукт з высокай дабаўленай вартасцю. Напрыклад, сучасныя кармы, чым займаецца БНБК. «Мы там вырабляем камбікармы, якіх постсавецкая прастора, упэўнены, не ведае. Там мы можам перапрацаваць і камбікармамі прадаваць. Тыя, хто прадае збожжа і выхваляецца: «вось мы экспартавалі пшаніцу і іншае», вы падумайце, ці забяспечана ў вас жывёлагадоўля кармамі і ці ёсць там жывёлагадоўля? Некаторыя дзяржавы прадаюць шмат пшаніцы, зерня, кукурузы шмат. А потым купляюць малако і мяса», — сказаў ён. Таму пазіцыя Беларусі — павялічваць колькасць жывёлы, каб вырошчваць больш збожжа, карміць ім жывёлу і атрымліваць канчатковы прадукт — мяса і малако. «Галоўнае — гэта дабаўленая вартасць», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу, што такім чынам забяспечваюцца і новыя рабочыя месцы.

Прэзідэнт прывёў як прыклад грэчку. Так, беларускаму насельніцтву трэба прыкладна 25-27 тон грэчкі. А плануецца сабраць 30-32 тысячы тон, то-бок 3-5 тысяч тон грэчкі Беларусь можа прадаць. «Гэта дробязі, гэта невялікія грошы. Я не арыентую людзей на гэта. ***Мы павінны накарміць сваіх людзей, забяспечыць рынак. Суседзі з Літвы, Латвіі, Польшчы прыязджаюць, хочуць нешта купіць — няхай прыязджаюць.*** Ужо гандаль на гэтым заробіць. ***І людзям дапаможам, людзі будуць удзячныя, вяваць супраць нас не будуць.*** Гэта я да таго, што журналісты «свядомыя» і іншыя разважаюць, што Лукашэнка бязвіз увёў для таго, каб зарабіць грошы. А які дурань не жадае зарабіць грошы? Дзяржава жадае, і я гэтага жадаю. Але не гэта галоўнае. ***Галоўнае, каб людзі ўбачылі, што побач з імі жывуць нармальныя людзі, што яны неагрэсіўна настроеныя, што гатовыя ў цяжкую хвіліну дапамагчы.*** Глядзіш, і не будуць ваяўніча супраць нас настроеныя, гэта немалаважна. А тое, што яны купяць у нас на гэтыя капейкі, гэта нас не ўратуе», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы назваў журналістам галоўны мінус сельскай гаспадаркі — недахоп грошай. «Было б пабольш грошай, у сельскай гаспадаркі грошы кінуў бы ў першую чаргу на меліярацыю. Трэба аднаўляць тое, што эксплуатуем ужо дзясяткамі гадоў, — каналы, дрэнаж. Я накіраваў бы гэтыя грошы і на адсталыя гаспадаркі, развіццё фермерства», — падзяліўся ён.

«Ідзе перадзел свету»

Падчас размовы была закранута і міжнародная тэматыка. Журналісты пацікавіліся, што беларускі лідар думае аб міжнародных падзеях апошніх дзён: двухдзённым палёце спікера канграса ЗША Нэнсі Пеласі на Тайвань, канфлікце Сербіі і Косава, заявах НАТА аб гатоўнасці ўмяшацца. «Памятаеце, калі пачаўся ковід, вы мяне не разумелі, нехта ненавідзеў, калі я казаў пра каронапсіхоз. А потым я спрабаваў растлумачыць, навошта і чаму гэта ўсё адбываецца. І сказаў, што пачаўся перадзел свету. Сёння ён у разгары. Спрабуюць перадзяліць свет, спрабуе кожны моцны (як ён сябе лічыць) адкусіць кавалак у суседа, яшчэ недзе, каб забяспечыць свой уплыў настолькі, наколькі ён псіхалагічна тое разумее. І ў авангардзе ЗША. Ім ужо і кусаць не трэба, у іх іншая праблема — захаваць гэтае панаванне, і каб захаваць яго, яны такім чынам дзейнічаюць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу, што пандэмія абвастрыла ўсе балячкі сусветнай палітыкі. Нагадаў пра верталётныя грошы, якія раскідваў Еўрасаюз, пра тое, што амерыканцы штампавалі грошы. «Я казаў, што гэта праз бок вылезе. ***Цяпер інфляцыя ў свеце шалёная, а інфляцыя — вельмі цяжкі час для эканомікі. І мы спрабуем супрацiўляцца інфляцыі, але пакуль цярпіма. Цяжкія гэтыя моманты, але пакуль цярпіма»,*** — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што многія праблемы ўзніклі менавіта з-за нерацыянальнасці кіравання дзяржавамі: «Паглядзіце на тыя дзяржавы, вы там бачыце хоць бы аднаго нармальнага кіраўніка? Іх там няма. І вось куча гэтых праблем стварылася праблемы ў эканоміцы. Хто б падумаў, што квітнеючая Германія будзе рэкамендаваць сваім людзям прымаць душ два разы на тыдзень, а не кожны дзень. ***Усюды дэфіцыт тавараў. А галадуха, галеча заўсёды спараджае канфлікты і войны. Яны за кошт гэтага жадаюць паказаць, што яны эфектыўныя, і адвесці народ ад гэтых праблем. Маўляў, ва Украіне вайна, цярпіце. Нейкі час людзі будуць цярпець, а потым спытаюць. Вось комплекс прычын»,*** — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што праз пандэмію пачаўся перадзел свету. Цяпер паспрабавалі пераключыць увагу на воспу малпаў. Але людзі не адрэагавалі, і тады «вярнулі» ковід. Аднак, па яго словах, ужо вядома, што ковід стане сезоннай хваробай. І калі восенню будуць сезонныя ўспышкі, не трэба шалець, трэба проста лячыць людзей і глядзець за сабой. ***«Гэта шаленства, якое пачалося да ковіду і абвастрылася падчас яго, працягваецца, і з гэтай сітуацыі нядбайныя кіраўнікі спрабуюць выйсці і вывесці свае дзяржавы праз канфлікты і войны»,*** — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Журналісты нагадалі Прэзідэнту пра яго візіт у Бялград у 1999 годзе, які прайшоў пад бамбёжкамі НАТА, і пацікавіліся, што цяпер Беларусь можа зрабіць для Сербіі. Як вядома, на мінулым тыдні ўзаемаадносіны паміж Сербіяй і Косава вельмі абвастрыліся, пра сваю гатоўнасць умяшацца ў вырашэнне канфлікту ўжо заявіла НАТА. «Тады сапраўды было небяспечна. І да сёння перад вачыма выпадак, калі натаўцы, якія там бамбілі ўсё, апусцілі мой самалёт на 500 метраў. Яны думалі, што я вярнуся, але я загадаў пілотам ляцець. Вядома, яны маглі б і збіць мой самалёт, але гэта ўжо было б надзвычайна. І я пад бамбёжкамі прыляцеў. А праз некалькі гадоў пасля таго кіраўніцтва Сербіі далучылася да нейкіх санкцый супраць нас. Таму цяпер я ў роздумах. Але і з іншага боку, гэта наш народ. Сербы добрыя, талковыя людзі. Ну не пашанцавала ім у чымсьці», — падзяліўся Аляксандр Лукашэнка.

Ён прызнаўся, што не ведае, як дапамагчы сербам. І падкрэсліў, што варта паглядзець, як Сербія паводзіла сябе зусім нядаўна, калі супраць Беларусі ўводзілі санкцыі. Прэзідэнт правёў паралель з Украінай. «Яны там кажуць: «Вось, мы на Лукашэнку маліліся... А вось як ён мог паступіць?!» Мяне ж там як агрэсара падаюць ва Украіне. А я так рэзка рэагую: а як вы маглі аб'явіць нам эканамічную вайну пры нашай пазіцыі тагачаснай, да вайны? Мы ж праводзілі дружалюбную, міралюбівую пазіцыю. ***Мы ж украінцаў падтрымлівалі, дзе толькі маглі. Яны супраць нас эканамічныя санкцыі ўвялі, закрылі неба і іншае. І пачалі нас дзёўбаць па ўказцы амерыканцаў. А цяпер закрычалі: «Вось, мы на Лукашэнку маліліся, а як ён мог паступіць?!» Дык вы паглядзіце, як вы зрабілі да гэтай ваеннай расійскай аперацыі. Дык у мяне яшчэ хапае цярпення, яшчэ чагосьці...»*** — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Ён падкрэсліў, што кожныя суткі ў Беларусь з Украіны прыязджае да 500 чалавек. Іх кормяць, лечаць, многім даюць грамадзянства і работу. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта нашы людзі. Дакладна так і ў Сербіі.

«Трэба падзяляць кіраўніцтва і звычайны народ. Станьце на маё месца, як бы вы гэта ўсё разумелі. Вядома, сербскаму народу трэба дапамагаць, і давядзецца дапамагаць. Мы такія людзі. Але мы ўлічваем палітыку Сербіі ў дачыненні да Беларусі. Ну, калі яны хочуць там, як той казаў, на трох крэслах уседзець, у іх не атрымаецца. Тут мы, Расія, Еўрасаюз, Амерыка і іншыя. І ўсюды хочуць, каб было добра. Але ім не дадуць сядзець на гэтых усіх крэслах, і перш за ўсё еўрасаюзаўцы, куды яны так імкнуцца», — сказаў Прэзідэнт.

У працяг тэмы з Украінай журналісты пацікавіліся, што Аляксандр Лукашэнка думае наконт пастаўкі збожжа з Адэсы ў Турцыю. «Яны ў чарговы раз стварылі амаль фэйк: маўляў, калі б Украіна магла вывезці збожжа, то голаду ні ў Еўропе, ні ў Афрыцы б не было. Пры гэтым нават у лепшыя часы Украіна забяспечвала толькі паўтара працэнта экспарту збожжа. Гэта нішто, арыфметычная хібнасць. І яны пачалі абвінавачваць і нас, і Расію, што мы агрэсары, не даем вывезці вялікую колькасць украінскага збожжа, таму голад. Але мы з Пуціным адразу разабраліся ў сітуацыі і адрэагавалі, прадставіўшы магчымыя маршруты для транспарціроўкі: «Калі ласка, вывозьце. Самае таннае — праз Беларусь, вязіце. А не, жаба душыць: як гэта — прыйшлі зноў да дыктатара прасіць, каб збожжа дапамог вывезці? Хоць на чайнай лыжцы, напэўна, вывозяць, чыгункі нейкая аплата была, як мне прэм'ер-міністр далажыў». Мы нават на гэта не глядзім — хочаце, вывозьце. Пачалі вывозіць», — сказаў Прэзідэнт. Аднак, па яго словах, ім трэба прыгожа выйсці з сітуацыі. Сустрэліся ў Турцыі, дамовіліся — і павезлі збожжа. Але, як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, тых 20 суднаў, якія яны вязуць, нават Турцыі не хопіць. Іран ужо дамаўляецца з Расіяй, каб пастаўлялі збожжа з новага ўраджаю. «Таму гэта проста гульні. У СМІ пачалі гарлапаніць: «Голад! Прычына голаду — тут, у Расіі і Беларусі». Калі мы ім сказалі: «Давайце», — даводзіцца даваць. Вы хутка ўбачыце, гэтая тэма сыдзе, яна ўжо сыходзіць. А тое, што застанецца, вы ўбачыце, чаго гэта варта. Гэта балбатня, не больш», — заявіў беларускі лідар.

«Мы абаронім гэтыя сем'і»

Успомнілі і сітуацыю з інтэрв'ю Прэзідэнта вучням Рыжскай акадэміі радыё і тэлебачання. Яны журналісты перад адкрыццём «Славянскага базару ў Віцебску» ўзялі інтэрв'ю ў Аляксандра Лукашэнкі, а пасля вяртання дадому, у Латвію, іх сталі за гэта цкаваць. «Людзей, дзяцей пачалі, як мне дакладваюць, ціснуць, цкаваць. Вось вам дэмакратыя. Мы зробім усё для гэтых дзяцей і для гэтых сем'яў. Усё, што ім трэба, мы зробім. Яны ж у нас не просяць ні грошай, ні кватэр, ні жылля. Адзінае, яны звярнуліся з просьбай у паскоранай форме атрымаць беларускае грамадзянства. У нас жа няма праблем. Вядома, мы абаронім гэтыя сем'і і гэтых дзяцей. Няхай прыязджаюць. Добрыя дзеткі. У нас месца хапае. Будуць працаваць — будучыня журналісты. Навучым, тэхніку купім. Няхай пацярпелыя быццам бы з-за нас людзі думаюць пра нас добра», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі атрымаць грамадзянства вельмі проста. І спрошчваць механізм прыняцця грамадзянства ўжо няма куды. Ён прывёў прыклад перасяленцаў з Украіны. «Як толькі ўзнік канфлікт, я даручыў адміністрацыі, губернатарам хутка заявы сабралі, праз пару месяцаў яны атрымалі грамадзянства. Хутчэй ужо не бывае. Бо ў нас Прэзідэнт можа прыняць у грамадзянства. А мне на стол дакументы — затрымкі не будзе. Дакладна так будзе і літоўцам, латышам і палякам», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што спецыялістаў, якія хочуць жыць і працаваць у Беларусі, тут будуць рады бачыць. ***«Будзем усё рабіць, каб прыняць у нашу беларускую сям'ю самых прыстойных і добрых нашых суседзяў. І не толькі суседзяў. Хто хоча ў нас працаваць, жыць па-беларуску, калі ласка, дзверы адчыненыя»,*** — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Валерыя СЦЯЦКО,
Мядзельскі раён.

Медыяпрастора

Што патрэбна нашым СМІ?

Праекты, якія прымушалі б чытачоў задумвацца аб гісторыі краіны і яе будучым

Такое меркаванне выказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА ў час наведвання Выдавецкага дома «Беларусь сегодня».



Фота БелТА.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта наведаў выдавецкі дом, каб павіншаваць супрацоўнікаў рэдакцыі газеты «СБ. Беларусь сегодня» з 95-годдзем выдання і ўручыць узнагароды. Ігар Сергеенка азнаёміўся з арганізацыяй работы медыяхолдынга, а затым паразмаўляў з працоўным калектывам у фармаце дыялогавай пляцоўкі, паведамляе БелТА.

«Напэўна, сёння адна з немалаважных задач для газеты — знаходзіць новых чытачоў у маладзёжным асяроддзі, знаходзіць тыя цікавыя праекты, якія будуць прываблівць, прымушаць задумвацца і аб гісторыі нашай краіны, і аб будучым, аб перспектывах развіцця», — сказаў Ігар Сергеенка.

Ён адзначыў, што выданне ідзе ў нагу з часам, запускае новыя праекты, развівае аўтарскую журналістыку. Паводле яго слоў, журналісты даносяць праўду да чытачоў, узнімаюць вострыя тэмы і дапамагаюць грамадзянам разабрацца ў пытаннях, якія іх хвалююць.

«Газета кожны год прырастае — якасцю. Сёння аўдыторыя не тое што не страчана, а павялічваецца, — заявіў Ігар Сергеенка. — Самае галоўнае, што ў калектыве і прафесіяналы, якія 20-30 гадоў працуюць тут, і моладзь, якая нядаўна скончыла вышэйшыя навучальныя ўстановы і прыйшла працаваць менавіта ў гэтае выданне».

У Добрушы адкрылі спарткомплекс

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У спартыўнай школе Добрушскага раёна сёння развіваюць лёгкую атлетыку, веласпорт, веславанне на байдарках і каноэ, грэка-рымскую барацьбу. Асаблівы ўпор у раённай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе робяць і на развіццё футбола. На шматзадачнасці і важнасці доўгачаканага аб'екта добрушскія спартсмены звярнулі ўвагу падчас адкрыцця спарткомплексу. Сімвалічны ключ ад «Юнацтва» атрымала дырэктар дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы Ала Дзяшчэня. У падарунак ад Беларускай федэрацыі футбола кіраўнік атрымала камплекты формы і футбольныя мячы.

Ганаровыя госці спартыўнага свята ў Добрушы — **старшыні абласнога і раённага выканаўчых камітэтаў Іван Крупко і Аляксандр Матарас, старшыня Беларускай федэрацыі футбола Уладзімір БАЗАНАЎ** — пакінулі аўтографы на мячы, што стане адным з сімвалаў спартыўнай школы ў раёне. Іван Крупко і Уладзімір Базанаў выканалі першы ўдар па мячы, які прынялі з рук галоўнага суддзі.

— Гэтае поле сапраўды будзе занятае з самай раніцы да позняга вечара. Цяпер у секцыі футбола тут займаецца больш за 150 дзяцей, каля 30 з якіх — дзяўчынкі. Думаю, колькасць спартсменаў з уводам новага поля значна павялічыцца, — падзяліўся Уладзімір Базанаў. — У рэканструкцыю ўкладзены бюджэтныя сродкі, дапамога Беларускай федэрацыі футбола і шмат сіл. У мясцовай спартыўнай школе займаюцца 530 атлетаў, сем увайшлі ў склад нацыянальных зборных. Абноўлены стадыён дасць новы імпульс для павышэння вынікаў.

Уладзімір Базанаў адзначыў значны ўклад кіраўніцтва вобласці ў рэканструкцыю як доўгачаканага спартаб'екта ў Добрушы, так і ў развіццё сучаснай спартыўнай інфраструктуры ў многіх рэгіёнах вобласці. У прыватнасці, на Гомельшчыне толькі за апошнія 2-3 гады футбольныя арэны высокага ўзроўню з'явіліся ў Калінкавічах, Мазыры, Петрыкаве, Светлагорску.

— У нашай вобласці ўвод спартыўных аб'ектаў становіцца добрай традыцыяй, — адзначыў старшыня аблвыканкама Іван Крупко. — Практычна штоквартальна адкрываюцца залы, пляцоўкі, шматфункцыянальныя цэнтры, басейны. Для мяне асабліва важна, што адбываецца гэта не толькі ў Гомелі, але і ў райцэнтрах, — падкрэсліў губернатар. Кіраўнік вобласці таксама звярнуў увагу, што фізічнай культурай і спортам у вобласці займаецца кожны чацвёрты жыхар. Загрузка фізкультурна-спартыўных устаноў вагаецца ў межах 72—96 %.

На Гомельшчыне не забываюцца і пра ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы аб'ектаў спартыўнай сферы. Па словах губернатара, да канца года ў рэгіёне плануюць адкрыць футбольныя арэны ў Чачэрску, Рагачове і аграгарадку Глушкавічы Лельчыцкага раёна. Таксама чатыры футбольныя пляцоўкі па праграме «Bonfesto — дзецям» рыхтуюць да адкрыцця ў Веткаўскім і Брагінскім раёнах, Лоеве і Чачэрску.

— Распачынаем распрацоўку праектна-каштарыснай дакументацыі басейна ў Гомелі, — нагадаў аб важных задачах спартыўнага будаўніцтва абласнога цэнтра Іван Крупко.

Старшыня Гомельскай абласной федэрацыі футбола Андрэй БАРАНОЎСКІ на цырымоніі адкрыцця спарткомплексу ў Добрушы падкрэсліў, што добраўпарадкаванне падобных спартаб'ектаў дае магчымасць палепшыць якасць вучэбна-трэніровачнага працэсу, павысіць узровень спартыўна-масавых і аздараўленчых мерапрыемстваў, а таксама заахвочваць усіх жыхароў Гомельшчыны да фізічнай культуры.

Падзяку за атрыманую магчымасць прымаць у райцэнтры спаборніцтвы раённага, абласнога і міжнароднага ўзроўняў падзякаваў старшыня Добрушскага райвыканкама Аляксандр Матарас. Ён адзначыў, што адкрыццё сучаснага спарткомплексу — доўгачаканы падарунак жыхарам раёна да Дня беларускага пісьменства, сталіцай якога Добруш стане ў хуткім часе. Вядома, што праграму агульнанацыянальнага свята вырашана дапоўніць футбольным турнірам, прысвечаным памяці Уладзіміра Рыжанкова. Удзел у спартыўным мерапрыемстве пацвердзілі таксама каманды з Бранскай вобласці.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

ПАПАЎНЕННЕ Ў РАДАХ СТАЛІЧНАЙ МІЛІЦЫІ

У гарадской ратушы ўручаны пагоны 70 маладым супрацоўнікам

У знакавым для сталічнай міліцыі рытуале прынялі ўдзел начальнік ГУУС Мінгарвыканкама генерал-маёр міліцыі Міхаіл Грыб, яго намеснікі, начальнікі службаў і падраздзяленняў ведамства, ветэраны органаў унутраных спраў. А галоўныя героі мерапрыемства — выпускнікі Акадэміі МУС і Магілёўскага інстытута МУС.

— Ваша маладосць, актыўнасць, настойлівасць, свежы погляд павінны стаць лакаматывам удасканалення не толькі мінскай міліцыі, але і ўсёй сістэмы ўнутраных спраў у цэлым, — адзначыў **Міхаіл ГРЫБ.** — Ваша задача — годна выконваць службовыя абавязкі: прысягу прымаюць адзін раз. Вы — дзяржаўныя людзі. Думайце над сваімі дзеяннямі і ўчынкамі. Увага і аналіз сітуацыі — галоўнае, што патрэбна ў нашай рабоце. Няхай непаўсюдныя ісцінамі для вас стануць адданасць прысязе, Радзіме, сапраўдным каштоўнасцям.

Начальнік ГУУС Мінгарвыканкама ўручыў маладым лейтэнантам табельную зброю і службовыя пасведчанні супрацоўнікаў ведамства.

Сярод тых, хто ў ліку 70 лейтэнантаў уліўся ў шэрагі праваахоўнікаў, — выпускнікі Акадэміі МУС Данііл Яфрэменка і Артур Вараўка. Абодва скончылі факультэт крымінальнай міліцыі. Абодва будуць працаваць у аддзеле па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі РУУС Фрунзенскага раёна.

— Выдатны калектыў, цікавая праца — гэта тое, да чаго імкнуліся ўсе гады вучобы, — расказалі мне хлопцы. — Раскрыццё эканамічных злачынстваў — няпростая, але гаваровая праца. Ад добрасумленнага вядзення бізнесу залежаць узровень жыцця супрацоўнікаў прадпрыемстваў і дабрабыт краіны.

Лейтэнант міліцыі, інспектар ДПС Савецкага РУУС горада Мінска Яўген ВАЛАНЦЕЙ падзяліўся з карэспандэнтам «Звязды» сваімі ўражаннямі:

— Чатыры гады адвучыўся ў Акадэміі МУС, спасцігаў асновы нашай службы. Канешне, я меў тэарэтычныя ўяўленні аб тым, якой будзе наша служба, хадзіў на практыку, але ў жыцці ўсё зусім іншае. Цяпер працую ў складзе інспектараў ДПС Савецкага РУУС. Праца цікавая, і мне падабаецца. Таксама я люблю мець жывыя зносіны з людзьмі, сустракаю розны кантынгент.

Што датычыцца нашага мерапрыемства, то ўсё вельмі ўрачыста. Так і чакаў, што збяруць усіх выпускнікоў, каб ва ўрачыстай абстаноўцы ўручыць пасведчанні, выказаць важныя парады перад тым, як паўнавартасна ўлілася ў калектыў супрацоўнікаў ГУУС сталіцы.

Маладыя афіцэры, якія атрымалі сёння службовыя пасведчанні, будуць працаваць у падраздзяленнях крымінальнага вышуку, па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі, супрацьдзеянні кіберзлачыннасці, наркакантролю і супрацьдзеянні гандлю людзьмі, у дарожна-патрульнай службе і гэтак далей. Многія пачнуць кар'еру з пасады ўчасткавага інспектара.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Сусветны ядзерны арсенал склаў каля 13 тысяч боегаловак

Ядзерны арсенал дзевяці краін свету, па стане на пачатак 2022 года, у сукупнасці склаў 12,7 тысячы боегаловак. Пра гэта згадваецца ў новым даследаванні Федэрацыі амерыканскіх вучоных. «Нягледзячы на прагрэс у скарачэнні арсеналаў ядзернай зброі з часоў «халоднай вайны», у свеце сукупны запас ядзерных боегаловак застаецца на вельмі высокім узроўні», — адзначаецца ў дакументе. Прыблізна 90 працэнтаў усіх боегаловак належыць Расіі і Злучаным Штатам, у кожнай з якіх ёсць больш за пяць тысяч ядзерных боепрыпасаў. З улікам разгорнутых, змешаных на складах і тых ядзерных боегаловак, якія чакаюць утылізацыі, дзевяць краін валодаюць наступнай колькасцю зброі: Расія — 5977, ЗША — 5428, Кітай — 350, Францыя — 290, Вялікабрытанія — 225, Пакістан — 165, Індыя — 90, Паўночная Карэя — 20, адзначаецца ў даследаванні. У гістарычным кантэксце колькасць ядзерных узбраенняў у свеце значна скарацілася з часоў «халоднай вайны» — з пікавага значэння прыкладна 70,3 тысячы ў 1986 годзе.

У амерыканскіх штатах Нью-Ёрк, Каліфорнія і Ілінойс аб'яўлены надзвычайны рэжым з-за ўспышкі воспы малпаў

Губернатар Каліфорніі Гэвін Ньюсам адзначыў, што штат атрымаў больш за 61 тысячу доз вакцыны ад воспы. Насельніцтву ўжо зрабілі больш за 25 тысяч прышчэпак, паведаміла ТАСС. Губернатар штата Ілінойс Джэй Роберт Прыцкер паабяцаў мясцовым жыхарам выдзеліць рэсурсы, неабходныя для забеспячэння іх бяспекі. Паводле даных амерыканскіх федэральных цэнтраў па кантролі і прафілактыцы захворванняў, Нью-Ёрк трымае лідарства па колькасці заражэнняў воспай малпаў — звыш 1,3 тысячы хворых. У штаце Каліфорнія зарэгістравалі звыш 820 выпадкаў заражэння воспай малпаў, у Ілінойсе — звыш 520. 23 ліпеня генеральны дырэктар СААЗ Тэдрас Гебрэсус аб'явіў успышку воспы малпаў надзвычайнай сітуацыяй у галіне аховы здароўя. Усяго ў свеце гэтая хвароба зарэгістраваная ў больш чым 22,2 тысячы чалавек у 70 краінах. Больш за ўсё ў ЗША — амаль пяць тысяч. У Еўропе спіс краін, дзе найбольш захварэлых на воспу, узначальвае Іспанія — 4,3 тысячы, у Германіі зафіксавана каля 2,6 тысячы выпадкаў.

Інфляцыя ў Паўднёвай Карэі ў ліпені дасягнула максімуму за 24 гады

Спажывецкія цэны ў Паўднёвай Карэі ў ліпені ўзраслі на 6,3 працэнта адносна таго ж месяца мінулага года, сведчаць даныя статупраўлення краіны. Гэта максімальныя тэмпы павышэння інфляцыі ў краіне амаль за 24 гады — з лістапада 1998-га. У чэрвені цэны павялічыліся на 6 працэнтаў. Рост абумоўлены падарожаннем энергарэсурсаў і прадуктаў харчавання, а таксама паслуг. Тэмпы павышэння спажывецкіх цэн перавышаюць два працэнты — мэтавы ўзровень Банка Карэі — на працягу 16 месяцаў запар. Пад'ём цэн у ліпені адносна папярэдняга месяца склаў 0,5 працэнта пасля павышэння на 0,6 працэнта ў чэрвені.

МАНІТОРЫНГ ПАВЕТРА, ВАДЫ І ЗЯМЛІ

Індыкатар стану навакольнага асяроддзя

Нацыянальная сістэма маніторынгу як такая была створана ў Беларусі ў 1993 годзе. Сюды ўваходзяць 13 відаў маніторынгу па асноўных кампанентах навакольнага асяроддзя. Гэта маніторынг атмасфернага паветра, паверхневых і падземных вод, зямель, лясоў, расліннага і жывёльнага свету, азонавага слою, радыяцыйныя, фізічныя маніторынгі, лакальны маніторынг наваколля. У 2015-м з'явіўся комплексны маніторынг натуральных экалагічных сістэм на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях (ААПТ), а сёлета далучыўся комплексны маніторынг тарфянікаў, расказала **Марына КАЛІНОВІК, кансультант упраўлення аналітычнай работы, навукі і інфармацыі галоўнага ўпраўлення экалагічнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва і навукі Мінпрыроды.**

— У межах маніторынгу спецыялісты назіраюць, якія тэндэнцыі існуюць, ацэньваюць і прагназуюць змяненне даных. Маніторынг — гэта індыкатар стану навакольнага асяроддзя, дзякуючы якому відаць, дзе неабходна найбольш аператыўнае рэагаванне.

За радыяцыйны і лакальны маніторынг, а таксама маніторынг паветра і паверхневых вод адказвае Мінпрыроды. Камітэт дзяржаўнай маёмасці маніторыць землі, НАН Беларусі займаецца геафізічным комплексным маніторынгам ААПТ, маніторынгам жывёльнага і расліннага свету, а таксама тарфянікаў.

Штогод ствараецца навуковы агляд нацыянальнай сістэмы маніторынгу, які змяшчаецца на сайце https://www.nsmos.by і даступны ўсім зацікаўленым. На лічбавы варыянт прадстаўлення звестак перайшлі з 2006-га. А змешчаная тут інфармацыя будзе карыснай пры напісанні курсавых работ, дыпломаў і нават дысертацый, а таксама тэрытарыяльным органам Мінпрыроды і мясцовым уладам, паколькі ўсе звесткі абгрунтаваныя і заканадаўча падмацаваныя, заўважыла Марына Каліновік. Падрабязная інфармацыя з картамі ў анлайн-рэжыме з аўтаматычных пунктаў назірання змяшчаецца таксама на сайце Белдзяржгідрамета:

— Акрамя маніторынгу, якім займаюцца дзяржорганы і які фінансуецца з бюджэту, існуе лакальны маніторынг, адказнасць за які нясуць прыродакарыстальнікі і развіваюць яго за ўласныя сродкі. Пры гэтым Мінпрыроды адказвае за колькасць і месцы размяшчэння пунктаў назірання ў межах лакальнага маніторынгу.

Назіранне бесперапыннае, дыскрэтнае, раз на год і раз на месяц

З 2017 года Галоўны інфармацыйна-аналітычны цэнтр Нацыянальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя (ГІАЦ НСМНА) функцыянуе на базе службы экалагічнай інфармацыі Белдзяржгідрамета. Гэтая арганізацыя адказвае за маніторынг паверхневых вод, атмасфернага паветра і радыяцыйны маніторынг, абазначыла **Паліна ПАЛЬЧЭХ, вядучы інжынер службы экалагічнай інфармацыі Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя:**

— Маніторынг атмасфернага паветра Мінска праводзіцца на 12 пунктах назірання, у тым ліку пяці аўтаматычных станцыях і сямі пунктах з дыскрэтным рэжымам адбору проб. На аўтаматычных станцыях на праспекце Незалежнасці, вуліцах Ціміразева, Радыяльнай, Каржанеўскага і Герояў 120-й дывізіі назіранне за ўтрыманнем забруджвальных рэчываў вядзецца бесперапынна, а на дыскрэтных пунктах — тры-чатыры разы за суткі.

Метэаралагічныя ўмовы летась у асноўным былі спрыяльнымі для рассейвання забруджвальных рэчываў у прыземным слоі атмасферы, і якасць паветра ацэньвалася як добрая, вельмі добрая і ўмераная, паведаміла эксперт. Нестабільная экаабстаноўка адзначалася ў асобныя непрацяглыя перыяды. У лютым, напрыклад, у адным з раёнаў назіралася павелічэнне ўзроўню забруджвання паветра азотадыяксідамі. Павелічэнне ўтрымання ў паветры цвёрдых часціц зафіксавана ў красавіку і напрыканцы ліпеня, а ўвогуле летам адзначаецца павелічэнне ўтрымання фармальдэгіду прыземнага азону.

Маніторынг паверхневых вод на тэрыторыі Мінска праводзіцца ў вадзе рэк Свіслач, Лошыца, вадасховішчаў Лошыца і Дразды, а таксама возера Камсамольскае. Назіранне па гідрабіялагічных паказчыках у іх праводзіцца раз на год, па гідрахімічных — раз на месяц, а на вадаёмах — чатыры разы на год кожныя два гады. У асноўным стан паверхневых вод ацэньваецца як добры, удакладніла спецыяліст. Як паказвае практыка, прыярытэтныя рэчывы, залішняя канцэнтрацыя якіх найчасцей за іншыя фіксуецца ў вадзе, — гэта біягенныя элементы (р. Свіслач каля н. п. Каралішчавічы і р. Лошыца), радзей — арганічныя рэчывы.

Электратранспарт, веладарожкі, метро

Лакальны маніторынг у Мінску праводзяць буйныя прадпрыемствы («Мінскэнерга», Мінскі трактарны завод, «Керамін», «Мінсккамунцепласеткі» і іншыя) па крыніцах, агульная колькасць якіх перавышае 80, расказала **Настасся ПРАКАПОВІЧ, начальнік аддзела кантролю за аховай атмасфернага паветра, водных рэсурсаў і нетраў Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

— Пры наяўнасці перавышэнняў па гэтых крыніцах лакальнага маніторынгу шкода наваколлю не выстаўляецца. Робіцца гэта толькі тады, калі даныя будуць зафіксаваны з дапамогай аўтаматызаваных сістэм кантролю. Па выніках леташніх назіранняў перавышэнняў у Мінску ўстаноўлена не было.

Па папярэдніх ацэнках паветра, валавы агульны выкід за 2021-ы паменшыцца на 1,2 тысячы тон і складзе менш за 130 тысяч тон. Скарачэнне выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасферу ад стацыянарных мабільных крыніц дасягнута за кошт ліквідацыі крыніц выкідаў, павышэння эфектыўнасці газаачысных установак, абнаўлення аўтапарка, пашырэння сеткі электрафіцыраванага транспарту, дадала яна.

У зоне асаблівай увагі камітэта — кантроль за выкананнем умоў ажыццяўлення выкідаў забруджвальных рэчываў у паветра Мінскім трактарным заводам у частцы рэканструкцыі ліцейнай вытворчасці. Сёлета прадпрыемства плануе ўвесці ў эксплуатацыю дзве індукцыйныя печы, што дазволіць скараціць выкіды на 1600 тон у год (8,7 % ад агульнай колькасці выкідаў прадпрыемстваў горада) і палепшыць экаабстаноўку ў зоне ўплыву МТЗ.

Больш за 80 % забруджвання паветра стварае аўтатранспарт, таму пераход ад вуглевадароднага транспарту да электрычнага — адзін з напрамкаў укаранення і пашырэння выкарыстання нізкавугляродных тэхналогій, якія садзейнічаюць пераходу да вугляроднай нейтральнасці, адзначыла Настасся Пракаповіч:

— У межах нацыянальнага плана дзеянняў па зялёнай эканоміцы ў Мінску ўжо 42 % электрыфікаваных пасажырскіх сродкаў пры плане дзяржпраграмы «Транспартны комплекс» на 2021—2025 гады 27,4 %.

Лекі, шыны, батарэйкі...

Штогод у Мінску ствараецца каля трох мільёнаў тон адходаў вытворчасці. Амаль усе яны перапрацоўваюцца — больш як 90 % з іх падлягаюць выкарыстанню. Камунальнага ж смецця ствараецца штогод каля 700 тысяч тон, і толькі каля 30 % такіх адходаў вымаецца і перапрацоўваецца, адзначыла **Алена АЎРАМЕНКА, начальнік аддзела кантролю за абыходжаннем з адходамі Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

— Для адходаў, якія ўтрымліваюць ртуць, а таксама батарэек, лямпаў, бытавой тэхнікі і небяспечных адходаў арганізаваны збор у кантэйнеры ў месцах продажу такога абсталявання. Для вывазу буйнагабарытнай тэхнікі існуе заявачны прынцып ад насельніцтва.

Пратэрмінаваныя лекі можна прынесці ў спецыяльныя кантэйнеры ў 20 сталічных паліклініках (потым іх вывезуць на спальванне). Летась мінчане прынеслі больш за 1000 тон такога смецця. Летась «Мінскзелянбуд» увёў у эксплуатацыю лінію па кампасціраванні «зялёных адходаў», якія ствараюцца на тэрыторыях агульнага карыстання.

— З адходамі шкла, паперы і пластыку, якія збіраюцца ў асобныя кантэйнеры, сітуацыя горшая, бо ўсе гэтыя адходы ў змешаным выглядзе адпраўляюцца на сартавальныя лініі, — дадала эксперт. — Прычына, што такія адходы слаба перапрацоўваюцца, па-першае, у тым, што насельніцтва збірае недастаткова такіх адходаў праз кантэйнеры. Па-другое, у змешванні такіх адходаў у смеццявозе, дзе яны ўшчыльняюцца, пасля чаго адсартаваць адходы практычна немагчыма.

Ірына СІДАРОК.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Высокія тэхналогіі ў цане

Па выніках мінулага года Беларусь знаходзіцца ў топавай тройцы краін Усходняй Еўропы па экспарце камп'ютарных паслуг краін — членаў ААН. Пры гэтым экспарт камп'ютарных паслуг на душу насельніцтва ў краіне летась павялічыўся на 20 % і склаў 320 долараў, паведамляецца на сайце Парка высокіх тэхналогій (ПВТ). Сумарны экспарт паслуг у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій (ІКТ) у 2021-м дасягнуў 3,2 млрд долараў.

Статыстычныя даныя былі агучаны падчас канферэнцыі ААН па гандлі і развіцці (ЮНКТАД — ад англ. United Nations Conference on Trade and Development). У межах асобнай краіны параметр экспарту камп'ютарных паслуг характарызуе ўзровень развіцця IT-сектара і яго значнасці для нацыянальнай эканомікі. Па выніках 2021-га гэты паказчык на душу насельніцтва ў Венгрыі склаў 276 долараў, Польшчы — 266, ЗША — 135, Паўднёвай Карэі — 156, Японіі — 75, Расіі — 44, Грузіі — 35 долараў.

Нагадаем, што найбуйнейшым пастаўшчыком камп'ютарных паслуг у Беларусі з'яўляецца Парк высокіх тэхналогій, са стварэннем якога краіна атрымала развітую індустрыю распрацоўкі камп'ютарных праграм, што даўно ведаюць не толькі ў краіне, але і за яе межамі. На долю Парка прыходзіцца каля траціны ўсяго экспарту паслуг краіны, і на працягу апошніх гадоў у аб'ёме экспарту паслуг павялічваецца доля камп'ютарных.

Ірына СІДАРОК.

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже объектов недвижимости

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – ОАО «АСБ Беларусбанк»

Наименование объекта продажи	**Лот 1** – изолированное помещение № 2 (назначение – административное помещение) общей площадью 2047,6 кв. м, состоящее из площадей 1-3 этажей трехэтажного административно-хозяйственного здания в г. Минске, ул. Киселева, 14. **Лот 2** – состоит из пяти изолированных помещений, расположенных на 1-5 этажах пятиэтажного здания в г. Минске, ул. Мясникова, 40: - изолированное помещение № 1 (назначение – административное помещение, 2 этаж) общей площадью 469,9 кв. м; - изолированное помещение № 3 (назначение – административное помещение, 4 этаж) общей площадью 503,1 кв. м; - изолированное помещение № 4 (назначение – административное помещение, 3 этаж) общей площадью 491,2 кв. м; - изолированное помещение № 6 (назначение – административное помещение, 5 этаж) общей площадью 206 кв. м; - изолированное помещение № 10 (назначение – помещение неустановленного назначения, 1 этаж) общей площадью 57,9 кв. м
Начальная цена продажи	**Лот 1** – 4 544 400,00 рублей (четыре миллиона пятьсот сорок четыре тысячи четыреста рублей 00 копеек) с учетом НДС. **Лот 2** – 10 526 009,50 рублей (десять миллионов пятьсот двадцать шесть тысяч девять рублей 50 копеек) с учетом НДС
Сумма задатка	**Лот 1** – 30 000,00 рублей (тридцать тысяч рублей 00 копеек). **Лот 2** – 50 000,00 рублей (пятьдесят тысяч рублей 00 копеек)
Обязательные условия	**Лот 1** – победителю торгов либо единственному участнику, изъявившему готовность приобрести реализуемое недвижимое имущество, заключить с ОАО «АСБ Беларусбанк» договор по приобретению имущества общей стоимостью 3 341,82 рубля (три тысячи триста сорок один рубль 82 копейки) с учетом НДС, предназначенного для эксплуатации отчуждаемого объекта недвижимости. **Лот 2** – победителю торгов либо единственному участнику, изъявившему готовность приобрести реализуемое недвижимое имущество, заключить с ОАО «АСБ Беларусбанк» договор по приобретению имущества общей стоимостью 48 027,83 рубля (сорок восемь тысяч двадцать семь рублей 83 копейки) с учетом НДС, предназначенного для эксплуатации отчуждаемых объектов недвижимости
Открытый аукцион состоится	**06.09.2022 в 11.00 по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 69/1, актовый зал (6-й этаж)**
Заявления и документы на участие принимаются	В рабочие дни с 9.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45 по 02.09.2022 включительно по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 69/1, кабинет 602 (тел.: (017) 2794655, (017) 2794930)
Продавец	ОАО «АСБ Беларусбанк»
Контактные данные	По вопросам, связанным с организацией осмотра объектов продажи, обращаться по телефонам: (017) 279 46 55 – Сосновский Дмитрий Викторович, (017) 279 47 74 – Баёк Павел Александрович

Для участия в открытом аукционе представляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка по 02.09.2022 включительно на счет № BY69AKBB66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Открытый аукцион проводится путем пошагового увеличения цены. Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 20 рабочих дней со дня проведения открытого аукциона.

Ваеннае пакаленне — мірнаму пакаленню

ПЕРАЖЫЦЬ ДАВЯЛОСЯ МНОГАЕ...

Нават тое, што здавалася немагчымым

З Любоўю Паўлаўнай Ругно мы пазнаёміліся ў шпіталі інвалідаў вайны. Не верылася, што ёй ужо дзевяноста (!). І што вось столькі наогул можна пражыць, нягледзячы на ўсе выпрабаванні.

— Маё дзявочае прозвішча Андрэева, — гаворыць жанчына. — Бацька, Павел Якаўлевіч, быў кадравым афіцэрам, маці, Ірына Пятроўна, працавала сястрой-гаспадыняй у бальніцы. У мяне быў старэйшы брат Валодзя. Мы жылі ў Быхаве і гора, можна сказаць, не ведалі, пакуль не пачалася вайна.

Перад самым яе пачаткам татаву вайсковую часць адправілі на вучэнні. З таго часу мы пра яго нічога не ведалі. Мама знішчыла ўсе дакументы, якія сведчылі, што мы афіцэрская сям'я. Такім чынам, нам пашчасціла заставацца жывымі і разам. А потым пачаліся аблавы.

Я добра памятаю, як прапаў наш Валодзя. Мама тады аббегала ўвесь горад, хадзіла ў камендатуру... Знаёмы чыгуначнік падказаў, што Валодзю разам з іншымі хлопцамі і дзяўчатамі немцы схапілі, загрузілі ў вагоны-цялятнікі, і цягнік паехаў. Куды? Невядома.

Нас з мамай схапілі падчас наступнай аблавы. Спалоханых і галодных, павезлі ў Германію... Помню, як высадзілі на нейкай станцыі, далі па дзве вараныя бульбіны, як сталі сартаваць: мужчын і жанчын — асобна, дзяцей — асобна. Нам, адарваным ад маці, загадалі грузіцца ў машыны...

Любе тады было 14, яна спатыкнулася — упала пад грузавік. Маці ў тым гармідары загадала ёй ні ў якім разе адтуль не вылазіць... Такім чынам ім пашчасціла застацца разам.

...У новым лагеры, у драўляных бараках за калючым дротам, маці і дачка Андрэевы знаходзіліся два месяцы і галадалі так, што страшна ўспомніць: за шчасце лічылі, калі перападала па некалькі сухароў ды па місцы баланды.

Час ад часу лагер наведвалі баўэры, што выбіралі работнікаў для сваёй гаспадаркі. Адна з немак пальцам паказала на Ірыну Пятроўну і Любу. Так маці і дачка сталі батрачкамі.

На ферме іх было некалькі: палякі Вацэк і Францык, украінкі Даша і Маша, рускі хлопец Васіль. Работы хапала ўсім: шматгектарнае поле, больш за дваццаць кароў, столькі ж свіней. А вось ежы...

Ірына Пятроўна і Люба жахнуліся, калі ў першы ж дзень у кашы, якая больш нагадвала рэдкі суп, заўважылі... чарвей. «Пратэставаць — пустая справа, — растлумачылі палякі, што працавалі тут два гады. — Іншай ежы не будзе. Прывыкайце да гэтай».

А што яшчэ заставалася, калі на тыдзень гаспадары выдавалі па кілаграме хлеба. На сняданак — гарачая вада без нічога, на вячэру — чарвівая каша, абеду не было зусім... Зрэдку, праўда, з'яўлялася магчымасць нешта ўхапіць на полі, на кухні альбо на ферме. Ды толькі з вялікай рызыкай, бо за ўсім і ўсімі пільна сачыла наглядчыца Гільда, якая дакладвала гаспадару аб кожнай «вольнасці з боку нахабных славян». А ўжо потым той гаспадар...

Ім быў высокі, на выгляд — інтэлігентны мужчына (казалі — эсэсавец, афіцэр, нейкая шышка). Раз-пораз ён на нейкі тыдзень-другі знікаў, а калі з'яўляўся...

— Пройдзе па полі, — успамінае Любоў Паўлаўна, — заўважыць прапушчаную пустазеліну, дык мала што накрычыць, наб'е, дык яшчэ і паставіць да сценкі, пачне страляць — у паветра як быццам, але ж хто яму, сабаку, верыў?

Факт, што палонныя жылі ў пастаянным страху.

Ці не найбольш даставалася Любе, якую немец любіў цягаць за вушы і біць... За што? За любую правіну: за тое, што з'ела некалькі клубніц, што на кухні выпіла трохі булёну ад варкі мяса, а на ферме — столькі ж сыраедою, за тое, што ў двухпавярховым асабняку не да бляску вымыла падлогі.

Эсэсавец увесь час і як толькі мог прыгнятаў, ішоў у наступ на сваіх паднявольных. Але ж неяк пайшлі і на яго. Люба тады даіла карову, немец назіраў, і яму здалося, што некалькі струменяў малака праляцела міма вядра. Таму ён падскочыў да дзяўчыны, стаў цягаць за вушы. Васіль, які працаваў паблізу на ўборцы гною, вырашыў заступіцца: наставіўшы вілы, рушыў на немца са словамі: «Ты што, гад, робіш?!» Нічога падобнага нелюдзь, відаць, не чакаў і, збялеўшы, стаў адступаць назад...

Ніхто не зразумеў тады, чаму ён не ўспомніў пра свой пісталет, не ўзяўся страляць? Відаць, добра служаўся, бо потым крыху паспакайнеў — перастаў лютаваць. Парабчукі лічылі гэта сваёй перамогай.

...А праз колькі месяцаў прыйшло і вызваленне. Дашу з Машай і дзвюх Андрэевых чырвонаармейцы ўзялі на работу ў вайсковую часць, потым яны вярнуліся ў свае родныя мясціны.

Любоў Паўлаўна скончыла школу рабочай моладзі, нейкі час жыла і працавала ў Кінешме, прыехала ў Быхаў. Тут выйшла замуж за афіцэра, з якім пераехала ў Гомель, выгадавала чацвярых дзяцей. У адной з дачок цяпер і жыве.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ,

г. Гомель.

Наўздагон

Дзе ж вы ўсе цяпер, сябры-аднапалчане...

Павестку на службу ў войска я атрымаў вясной 1969-га і, відаць, да скону буду помніць дзень 15 мая, калі разам з такімі ж прызыўнікамі (усяго звыш трохсот чалавек), пад гукі незабыўнага марша «Развітанне славянкі» ў выкананні зводнага духавога аркестра, як умеў, маршыраваў ад Мінскага абласнога ваенкамата да чыгуначнага вакзала. Рух транспарту па праспекце Машэрава (цяпер Пераможцаў) на гэты час быў спынены. Абапал праспекта, на тратуарах, стаяла мноства людзей: прызыўнікоў віталі сваякі, сябры, каханыя і проста знаёмыя дзяўчаты...

Нас, будучых дэсантнікаў, менавіта вось так праводзілі на службу.

А здымак я зрабіў праз некалькі месяцаў. На ім — удзельнікі семінара, сакратары камсамольскіх арганізацый з усіх падраздзяленняў 76-й гвардзейскай паветрана-штурмавой Чарнігаўскай Чырванасцяжнай дывізіі. У цэнтры — намеснік начальніка палітаддзела гвардыі маёр Левін. У другім радзе шостым злева стаіць мінчанін, радавы Аляксандр Марозаў. На кукішках, восьмы злева ў чацвёртым радзе — гвардыі радавы Тукаль...

Вельмі хацелася б стэлефанаваць, убачыцца з Віктарам Марцінкевічам, Генадзем Гладковым, Мікалаем Халадзінскім, Ігарам Валентам і многімі-многімі іншымі. Цешу сябе надзеяй, што яны жывыя-здаровыя, што, адзначыўшы дзень ПДВ, убачаць вось гэты здымак, успомняць службу і мо адгукнуцца?

Міхаіл ТАГІЛЬ,

Салігорскі раён.

Дзякуй!

Вы робіце вялікую справу —

вяртаеце людзей да прывычнага жыцця

Больш за 30 гадоў я выпісваю газету «Звязда». Падабаецца яе аператыўнасць, беларускасць, веданне жыцця, разуменне клопатаў людзей і жаданне дапамагчы ім у штодзённых справах. Для мяне як настаўніцы «Звязда» — незаменная дарадчыца ў падрыхтоўцы да ўрокаў, музейных экспанатаў, пазакласных мерапрыемстваў... Але ж цяпер зусім пра іншае.

Не так даўно мне прыйшлося звярнуцца ў клінічную бальніцу № 5, перанесці досыць складаную аперацыю. І яна сама, і далейшае лячэнне прайшлі паспяхова: як той казаў, без сучка ці задзірынкі, за што хочацца шчыра падзякаваць хірургу Аляксандру Міхайлавічу Фурсевічу, анестэзіёлагу Вользе Сяргееўне Амельчанцы, медсёстрам Міраславе Генадзеўне Урбан, Маргарыце Анатолеўне Казачонак, Ірыне Васілеўне Аляксандравай, Яне Іванаўне Дарашэвіч, усяму малодшаму персаналу.

Дзякуючы прафесіяналізму, добразычлівасці і зладжанай рабоце гэтых людзей я (і без сумнення, многія іншыя!) змагла паправіць сваё здароўе, вярнуцца да прывычных спраў. Так што нізкі паклон нашым медыкам і самыя шчырыя пажаданні моцнага здароўя, поспеху, дабрабыту, упэўненасці ў тым, што вы робіце найвялікшую справу — вяртаеце людзей да жыцця.

Аліна ПАХВАЛЁНАЯ,

г. Мінск.

Весткі з месцаў

БЫЎ БЫ НАСТРОЙ, а фэст... прыдумаем!

«Некалькі гадоў таму мы праводзілі свята кветак. Сёлета — захацелася нейкага новага. Дык чаму б не лёну? — расказвае загадчыца Аюцавіцкага сельскага клуба Вераніка Лабанава. — У конкурсах на найлепшы сноп і льняны вянок бралі ўдзел і дарослыя, і дзеці. Гасцей прымалі з розных куткоў краіны: з Мінска, Гродна, Карэліч...

Забягаючы наперад, скажам: там было на што паглядзець, што паслухаць і чым падсілкавацца.

— На кожнае свята я пяку дома хлеб і здобу, — кажа Людміла Ламаносава. — Рэцэпт крэкераў досыць просты: 500 г мукі, 200 г вады, тры лыжкі семені лёну, па чайнай лыжцы цукру і разрыхляльніка, крыху солі і ўсё ў духоўку. За 15-20 хвілін атрымліваецца вось такая смаката!

Сацыяльны работнік Таццяна Жураўлёва ўпрыгожыла святочны стол булкай у форме кветкі лёну:

— Я пякла яе па рэцэпце царскага куліча. Спачатку ставіла рошчыну, потым асобна ўзбівала 10 бялкоў і 10 жаўткоў, дадавала 200 г сметанковага масла, ванільны цукар, куркуму для залацістасці... Плюс шклянка цукру, соль, сода. Каб цеста не чарсцвела, дадаю алей...

Гаспадынькі так шчыра запрашалі пакаштаваць свае шэдэўры, — цяжка было адмовіцца! Усё і напраўду атрымалася смачным, а галоўнае, вельмі карысным, бо, як вядома, семя лёну ўмацоўвае імунітэт, памяншае колькасць шкоднага халестэрыну, здымае запаленне ў страўніку, нармалізуе ціск...

— Сёння я прыгатавала грэчаскі салат, у які дадала семя лёну і льняны алей, — кажа Галіна Нарбутовіч. — Гэтыя інгрэдыенты дадаюць незвычайныя ноткі.

Але ж не хлебам адзіным... На фэсце ўшанавалі сямейную пару Кулакоўскіх, якія адзначылі льняное вяселле. Сужэнцы кажуць, што жывуць разам ужо 18 гадоў, што ў іх

на дваіх пяцёра дзяцей і восем унукаў, аднак шлюбам яны пабраліся толькі ў 2018-м...

Падарунак атрымала і шматдзетная сям'я Чабаценкаў.

На свяце вызначылі аўтараў найлепшага вянка (ім, на думку гледачоў, стала 10-гадовая Дар'я Рабікіна, якая прыехала ў Аюцавічы да бабулі) і найлепшага снопу.

— Да гэтага конкурсу я рыхтавалася загадзя, — расказала яго пераможца — бібліятэкар Наталля Гаркавая. — Лён ірвала, калі быў зялёны (тады сцябліны не ломяцца)... Потым сушыла, упрыгожвала блакітнымі кветачкамі і капялюшыкам з ільняных нітак. Прыемна, што маю работу людзі ацанілі... Я вельмі люблю вось такія святы, яны патрэбныя вяскоўцам, каб пабыць разам, пагутарыць, павесяліцца.

На фэсце працавала дзіцячая забаўляльная пляцоўка, можна было купіць сувеніры. Музычныя нумары дарылі самадзейныя артысты Карэліччыны. Свята адбылося!

Іна ЛЕЙКА,

г. Карэлічы.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

ДРУГОЕ СЭРЦА МУЖЧЫНЫ

Проста аб праблемах прастаты

Прастата патрабуе рэгулярнага клопату аб сабе. Аднак шматлікія прадстаўнікі моцнай паловы дрэнна ведаюць, як засцерагчы яе ад захворванняў і як лячыцца правільна. Чым небяспечныя нерэгулярнае палавое жыццё і холад? Чаму на стале ў кожнага мужчыны павінны быць арэхі, зеляніна і гарбузовыя семачкі? Якія сляды на ўсё жыццё пакідае прастатыт? І з якімі сімптомамі варта адразу звяртацца да ўрача? Пра гэта і іншае гутарым з уролагам вышэйшай катэгорыі Вольгай АНТОНАВАЙ.

— Вольга Віктараўна, з-за чаго ўзнікаюць запаленчыя працэсы ў прастаце?

— Адразу адзначу, што прастата — другое сэрца мужчыны. Гэта той важны орган, ад якога залежыць настрой, жыццялюбства, стан душы, палавое і сямейнае жыццё. Таму яе нельга недаацэньваць.

Што датычыцца запаленняў у прастаце, на гэта ёсць некалькі прычын. Найперш сядзячы лад жыцця. Многія сёння шмат сядзяць падчас працы, і гэта выклікае застой у прастаце. Тое ж самае датычыцца і нерэгулярнасці палавога жыцця. Калі секс рэдкі, то застойныя працэсы ў прастаце вядуць да запалення.

— Рэдкі секс — гэта колькі?

— Раз на тры-чатыры тыдні. Тут, вядома, многае залежыць ад узросту і тэмпераменту. Італьянцы, напрыклад, і ўсходнія еўрапейцы генетычна маюць высокі ўзровень тэстастэрону. У іх патрэба — штодзень ці праз дзень, у славян патрэба можа быць ніжэйшай. Аднак сярэдні рытм, які рэкамендуе Сусветная арганізацыя аховы здароўя, — два-тры разы на тыдзень. Гэта лічыцца рэгулярным палавым жыццём. З практыкі магу сказаць, што запаленне ўзнікае ад адсутнасці сексу больш за тры-чатыры тыдні.

Яшчэ адным фактарам, акрамя застою, з'яўляецца холад. Мужчыны, якія любяць маржаваць, аблівацца халоднай вадой, скакаць пасля лазні ў купель ці халоднае возера, вельмі моцна рызыкуюць. Ад холаду запаленчы працэс можа зарадзіцца і абвастрыцца. Першапрычына — гэта ўласная мікрафлора, такія бактэрыі, напрыклад, як энтэракок ці кішэчная палачка, а правакацыйны фактар — холад.

Недахоп цынку ў харчаванні — яшчэ адна прычына. Багатыя на цынк морапрадукты — марская рыба, вустрыцы, крэветкі, мідыі, васьміногі. З беларускіх прадуктаў must have, якія мусяць быць у рацыёне кожнага мужчыны. Вось такія асноўныя правакацыйныя фактары.

Таксама вострае запаленне ў прастаце можа выклікаць ужыванне моцнага алкаголю ў вялікай дозе. Часта здараецца, што пасля добрага свята ўзнікае востры запаленчы працэс у прастаце.

— Як праяўляе сябе прастатыт? Ці можна гэтыя сімптомы з нечым пераблытаць?

— Востры запаленчы працэс ні з чым не пераблытаеш. Непакоіць высокая тэмпература цела, вышэй за 38 градусаў, напор струменю мачы становіцца слабым, з'яўляецца боль унізе жывата, пад яечкамі, у зоне прамежнасці. Для любога мужчыны высокая тэмпература і адсутнасць катаральных з'яў — насмарку, болю ў горле, кашлю — гэта нагода звярнуцца да ўролага, каб выключыць прастатыт.

— У якім узросце часцей здараецца прастатыт?

— У любым узросце. У маладых людзей гэта захворванне можа быць звязана з інфекцыямі, якія перадаюцца палавым шляхам, бо гэта сексуальна актыўны ўзрост. Але, як я ўжо казала, правакаваць іх можа і ўласная мікрафлора, абвастраючы праблему на фоне холаду ці застою.

У пажылых людзей таксама бываюць прастатыты. Яны звязаны з сядзячым ладам жыцця, пераахаладжэннем і нават гарманальнай перабудовай.

— Што рабіць, каб захворванне не перайшло ў хранічную форму?

— Весці здаровы спосаб жыцця — больш рухацца, хадзіць хаця б увечары. Калі вы на рабоце сядзіце, то праз кожныя 45 хвілін трэба 15 хвілін пахадзіць ці размяцца. Другі важны момант — знаходзіцца ў цяпле. Не трэба правакаваць развіццё прастатыту, скачучы ў халоднаю ваду пасля лазні, бо ўсё гэта можа сумна заканчвацца. Ну, і рэгулярнае палавое жыццё.

Калі ж узнік востры прастатыт, то толькі спецыяліст мусіць яго лячыць, і гэта дастаткова доўгі час — да месяца. Гэта захворванне, якое патрабуе сур'ёзнага падыходу.

— Якія аналізы варта здаваць? Як дыягнаставаць прастатыт?

— Пацыент мусіць прыходзіць да ўролага, які яго апытвае і робіць агляд. У першую чаргу як скрынінгавы метад прызначаецца ўльтрагукавая дыягностыка, дзе адразу відаць павелічэнне прастаты, павышэнне яе эхагеннасці. Ёсць яшчэ інструментальныя і лабараторныя даследаванні — аналізы крыві і мачы. У аналізе мачы таксама маюцца характэрныя для захворвання змяненні — павышэнне лейкацытаў, эрытрацытаў, бялку. Таксама ёсць прыбор, які вызначае ўрадынаміку — напор струменю мачы, хуткасць яе выдзялення.

Варта не саромецца і звярнуцца да ўролага. Падчас аднаго візіту ўсё будзе высветлена, і лячэнне прызначаць адразу.

— Чым небяспечны хранічны прастатыт? Ці ёсць у яго нейкія наступствы?

— Калі ў прастаце некалі быў востры запаленчы працэс, ён пакідае свае сляды. Гэта ачагі фіброзу і кальцынаты — адкладанні кальцыю ў ачагах запалення. Іх мы бачым на УГД як наступствы перанесенага вострага прастатыту. Папросту кажучы, гэта рубцы ў прастаце, якія самі па сабе не нясуць небяспекі.

Аднак важна добра лячыць востры працэс, каб не было пераходу ў хранічны. Апошні небяспечны тым, што магчымыя змяненні ў палавым жыцці, напрыклад, скарачэнне палавога акта ці парушэнне эрэкцыі. Таксама могуць быць расстройствы мочаспускання, напрыклад, напор струменю мачы становіцца слабейшым ці пачашчаецца мочаспусканне днём або ўначы. Яшчэ адзін момант — болі. Яны часта могуць узнікаць пад яечкамі ці ўнізе жывата, аддаваць у машонку, прамежнасць. Гэта ўласцівы прастатыту сімптом.

— А ці магчымае палавое жыццё падчас хваробы на прастатыт?

— Канешне. І палавое жыццё тут выступае нават як лячэбны фактар, бо адсутнасць сексу абцяжарвае прастатыт.

— Для жанчыны гэта не небяспечна?

— Калі запаленчы працэс не выкліканы патагеннымі мікраарганізмамі, інфекцыямі, якія перадаюцца палавым шляхам, то звычайна ніякай небяспекі для жанчыны няма. Аднак у кожнай сітуацыі трэба кансультавацца з уролагам.

— Што такое сіндром тазавага болю ў мужчын?

— Гэта цэлы сіндрамальны комплекс, які здараецца як у маладых, так і ў пажылых пацыентаў. Сіндром абдамінальнага болю (у жываце) — боль каля пупка і вышэй, а тазавы боль — гэта боль ніжэй пупка. Ён пастаянны і непакоіць, чалавек не можа жыць, спаць, есці, займацца сексам нармальна. Хранічны тазавы боль, які доўжыцца больш за тры месяцы, патрабуе расследавання (дадатковай дыягностыкі). Сіндром тазавага болю можа быць звязаны з многімі хваробамі. У жанчын гэта праблемы па гінекалогіі, у мужчын — з прастатай, яечкамі. Таксама прычынай болю могуць стаць кішэчнік ці пазваночнік. Калі маецца грыжа дыска ў паяснічна-крыжавым аддзеле пазваночніка, сціскаецца нервовы карэньчык, і па ходзе сядалішчнага нерва боль аддае ў тазавыя органы і ніз жывата. Таксама болі могуць выклікаць запаленне касцей таза, праблемы з тазасцегнавымі суставамі.

Кожны такі болевы сіндром патрабуе расследавання. Пачынаць звычайна рэкамендуюць з візіту да ўролага, бо часта сіндром тазавага болю звязаны з уралагічнымі праблемамі. Пры неабходнасці падключаюцца сумежныя спецыялісты, у прыватнасці неўролаг. Ці нават псіхатэрапеўт, бо хранічны тазавы боль вымотвае і вядзе да псіхасаматычных праяў, напрыклад дэпрэсіі.

— Ці ёсць нейкія сучасныя методыкі, якія дазваляюць хутчэй спраўляцца з тым жа прастатытам?

— Уролагі цяпер узброены выдатным абсталяваннем, якое дазваляе вельмі эфектыўна лячыць прастатыт, сіндром тазавага болю і нават паляпшаць палавое жыццё. На дадзены момант самае эфектыўнае — гэта сучасныя фізіяпрацэдуры. Адна з іх — ударна-хвалевая тэрапія. Фізіяпрацэдуру выконвае сам доктар. Спецыяльны апарат стварае хвалі, якія «прастукваюць» адпаведныя зоны. Гэта дазваляе прымацаваць выдатныя эфекты: паляпшэнне адтоку сакрэту і кровазвароту ў зоне прамежнасці, прастаты, яечак, дзякуючы чаму ўстараняецца запаленне і паляпшаецца палавая функцыя — і эрэкцыя, і працягласць палавога акту. Эфект ёсць нават на клетачным узроўні: аднаўляюцца клеткі крывяноснай і нервовай сістэм. Гэта новая методыка, якая прыйшла да нас з Германіі. Такая апаратура пакуль маецца ў нешматлікіх медыцынскіх цэнтрах.

Другі перспектыўны метад — HILT (High Energy Laser Therapy) — высокаінтэнсіўная лазерная тэрапія. Дзякуючы лазернаму ўздзеянню на нервовыя карэньчыкі зоны болю, за адзін-тры сеансы дасягаецца купіраванне болевага сіндрому. Гэта важны момант у ліквідацыі хранічнага тазавага болю ў мужчын.

І трэці метад — магнітатэрапія. Пацыент садзіцца ў адмысловае крэсла і, дзякуючы магнітнаму полю, дасягае супрацьацёчнага, супрацьболевага эфекту і паляпшэння палавой функцыі.

Гэта тры кіты, якія дазваляюць цалкам пазбавіцца прастатыту. Эфект вельмі добры.

— А ці ёсць методыкі для паляпшэння палавога жыцця?

— Ударна-хвалевая тэрапія — метад нумар адзін для паляпшэння сексуальных магчымасцяў і аднаўлення мужчынскай патэнцыі. Я гэта бачу на практыцы і магу сказаць: пакуль нічым іншым дасягнуць абнаўлення палавога жыцця немагчыма. Мужчыны з захапленнем кажуць, што нарадзіліся наноў.

БЕЛАРУСКІЯ ТРАНСПЛАНТОЛАГІ ЗРАБІЛІ ЎЖО 500 ПЕРАСАДАК СЭРЦА

У Беларусі ў РНПЦ «Кардыялогія» была паспяхова праведзена 500-я трансплантацыя сэрца, паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя.

Донарскае сэрца перасаджана 68-гадоваму мужчыну, які пакутаваў ад ішэмічнай кардыяміяпатыі і перанёс раней некалькі кардыяхірургічных аперацый. У раннім пасляаперацыйным перыядзе пацыент адчувае сябе здавальняльна і працягвае лячэнне ў аддзяленні анестэзіялогіі і рэанімацыі цэнтра.

Беларусь уваходзіць у лік 20 развітых краін свету з высокім узроўнем донарства органаў, апярэджваючы Канаду, Вялікабрытанію, Аўстралію і знаходзячыся прыкладна на аднолькавых пазіцыях з Францыяй і Італіяй. Колькасць трансплантацый у краіне складае 52 аперацыі на 1 мільён насельніцтва. Гэта ў пяць разоў больш, чым у Расіі, таксама мы апярэджваем Польшчу і Германію.

З лютага 2009 года ў РНПЦ «Кардыялогія» выконваюцца аперацыі па трансплантацыі сэрца, комплексаў «сэрца — лёгкія» і «сэрца — нырка». Трансплантацыя сэрца з'яўляецца радыкальным кардыяхірургічным метадам лячэння пацыентаў з тэрмінальнай стадыяй сардэчнай недастатковасці, якія дазваляюць падоўжыць ім жыццё і ажыццяўляць актыўную паўсядзённую дзейнасць.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
3 жніўня 2022 г. № 29 (665)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ФОРМУЛА ПОСПЕХУ:

поўны цыкл вытворчасці і вопытныя спецыялісты

Фота БелТА.

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА наведала сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Агракамбінат Сноў».

«У мяне самыя лепшыя ўражанні ад наведвання агракамбіната. На жаль, я ні разу да гэтага не была на гэтым сельскагаспадарчым прадпрыемстве, хоць з кіраўніком калісьці разам працавалі як члены Савета Рэспублікі. Я шмат ведаю аб гэтым прадпрыемстве, і тое, што тут убачыла, вядома, заслугоўвае ўсялякай пахвалы: цудоўныя палі, чакаецца выдатны ўраджай», — сказала Наталля Качанава.

Паводле яе назірання, у гаспадарцы ёсць усё для вырошчвання сельгаспрадукцыі, вырабу кармоў, малочных і мясных прадуктаў. «Тут поўны цыкл вытворчасці, адпаведна, у прадпрыемства высокая дабаўленая вартасць і добры фінансавы вынік. Не менш важна, што тут працуюць вопытныя кіраўнік і спецыялісты, яны вызначаюць тэмпы ходу ўборачнай кампаніі. Тое, што было сказана Прэзідэнтам на селектарнай нарадзе, яны прынялі як інструкцыю да дзеяння. Трэба захаваць ураджай да зярнятка, гэта вельмі важна ў цяперашніх умовах, калі ў свеце такія праблемы з прадуктамі харчавання, — канстатавала спікер. — Я па-добраму радуюся таму, што ў нас такая сельская гаспадарка ў краіне. Вельмі мудра было прынята рашэнне кіраўніком дзяржавы пабудаваць гэты малочнатаварны комплекс, сёння гэта дае цудоўныя вынікі. Акрамя таго, прадпрыемства пастаўляе якасныя прадукты харчавання ў Мінск».

«Вельмі важна, што тут працуюць маладыя спецыялісты. Моладзь прыязджае сюды, застаецца, нягледзячы на тое, што гэта гарадскія жыхары. Тут створаны ўсе ўмовы, каб жыць, працаваць, ствараць сем'і, гадаваць дзяцей: школы, дашкольныя ўстановы, Дом культуры, спартыўныя комплексы», — дадала Наталля Качанава.

Як адзначыў **галоўны аграном СВК «Сноў» Аляксандр ШАМАНАЎ**, ужо сабраны азімы ячмень. «Убіраем азімую пшаніцу, пачалі ўборку азімага рапсу. У гэтым годзе з улікам умоў надвор'я ўраджайнасць чакаецца вышэйшай за мінулагоднюю, — дадаў ён. — Поспехі нашага агракамбіната вызначаюцца дысцыплінай. Усё павінна быць зроблена ў агратэхнічныя тэрміны, нельга дапусціць ніякіх адступленняў. Каб атрымаць добры ўраджай, трэба выканаць усе тэхналогіі».

Паводле БелТА.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

«Суверэнітэт і незалежнасць — няўхільныя каштоўнасці нашага народа»

У штотыднёвым аглядзе расказваем галоўныя навіны з Савета Рэспублікі

• Прэзідыум Савета Рэспублікі выступіў з заявай у сувязі з разглядам Сенатам Кангрэса ЗША праекта рэзалюцыі па Беларусі. «Амерыканскія заканадаўцы ў чарговы раз у парушэнне Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый груба ўмешваюцца ва ўнутраныя справы Рэспублікі Беларусь, выстаўляюць бяздоказныя абвінавачанні ў яе адрас. Амерыканскім сенатарам даўно трэба засвоіць, што суверэнітэт і незалежнасць — няўхільныя для беларускага народа каштоўнасці, і ў гэтых пытаннях ніколі не будзе кампрамісу. Наша краіна — актыўны ўдзельнік інтэграцыйных эканамічных праектаў, донар бяспекі ў рэгіёне — заўсёды праводзіла і праводзіць міралюбівую знешнюю палітыку», — сказана ў заяве. У Прэзідыуме Савета Рэспублікі падкрэслілі: недапушчальна, што беларуская тэматыка неправамерна разглядаецца ў Сенаце ЗША на аснове адкрытых фэйкаў і дэзінфармацыі. «Краіне, якая пастаянна імкнецца навязваць усім свае праваабарончыя практыкі, міжнародная супольнасць павінна нарэшце ўказаць на наяўнасць праблем, якія востра стаяць у амерыканскім грамадстве, у тым ліку ў сферы захавання правоў чалавека: пераслед апанентаў дзеючай улады, разгул насілля з боку паліцыі, невыкананне прынцыпаў справядлівага судовага разбіральніцтва, найбольшая ў свеце колькасць выпадкаў заражэння і смерці ад COVID-19. У ментарскіх спробах «навучыць жыццю» іншыя дзяржавы амерыканскаму палітычнаму істэблішменту стала не да сваіх грамадзян, іх праблем і клопатаў. Сенатары ЗША ва ўпор не заўважаюць пагрозу ўнутранага крызісу, які разрастаецца, дэманструючы ў сваёй палітыцы поўную адарванасць ад рэальных запатрабаванняў амерыканскага народа, абсалютную няздольнасць разумець яго патрэбы», — гаворыцца ў заяве.

Прэзідыум Савета Рэспублікі заклікае амерыканскіх заканадаўцаў спыніць умяшанне ва ўнутраныя справы Рэспублікі Беларусь, спыніць злачынную дзейнасць па прымяненні аднабаковых незаконных санкцый, якія парушаюць міжнароднае права, і засяродзіцца на вырашэнні праблем свайго народа.

• Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, генеральны дырэктар ААТ «Беларуськалій» Іван Галаваты сустрэўся з губернатарам Пермскага краю Дзмітрыем Махоніным. Бакі абмеркавалі перспектывы супрацоўніцтва, у тым ліку ў рамках кааперацыі з машынабудаўнічымі прадпрыемствамі краю. Іван Галаваты і дырэктар Пермскага цэнтра акадэмік РАН Аляксандр Барах падпісалі Пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферах навукі, тэхналогій, інавацый і адукацыі.

• Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў правёў асабісты прыём грамадзян, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб. У адной з наведвальніц сур'ёзная жыццёвая сітуацыя, звязаная з палітычным становішчам ва Украіне. Традыцыйна ўзніміліся пытанні працаўладкавання.

«З аднаго боку, ёсць сітуацыі, дзе бачым, што мы як заканадаўцы павінны падумаць і, магчыма, прыняць пэўныя рашэнні, прапрацаваць з дзяржаўнымі органамі пэўныя дакументы, якія могуць дапамагчы грамадзянам. З іншага — сенатары шмат працуюць з насельніцтвам, працоўнымі калектывамі. Таму ад такіх прыёмаў атрымліваеш інфармацыю аб праблемах. Часам гэта можна экстрапаліраваць на краіну. Пры гэтым ёсць і тэмы чыста мясцовага значэння, дзе недапрацоўвае мясцовая ўлада», — падкрэсліў Сяргей Рачкоў.

Валерыя СЦЯЦКО.

БУДЗЕМ ЗНАЁМЫЯ!

Алена ПАСЮТА:

«ЛІЧУ ВАЖНЫМ МЕЦЬ КАНТАКТ З МАЛАДЫМ ПАКАЛЕННЕМ»

Новы старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў — у эксклюзіўным інтэрв'ю «Звязды»

НЯДАЎНА ў Гродне прайшла пазачарговая сесія аблсавета з адным пытаннем на парадку дня — выбарамі новага старшыні. Усе 39 дэпутатаў аддалі свае галасы за Алену Пасюту, якая да гэтага часу працавала намеснікам старшыні Шчучынскага райвыканкама і з'яўлялася дэпутатам абласнога Савета дэпутатаў. Алена Васілеўна па адукацыі філолаг, пасля заканчэння ГрДУ імя Янкі Купалы выкладала беларускую мову і літаратуру ў школах і гімназіі Шчучына. Ураджэнка Шчучынскага раёна.
Гэта першае інтэрв'ю Алены Пасюты на пасадзе старшыні Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў.

— Алена Васілеўна, вы перайшлі з выканаўчай галіны ўлады ў заканадаўчую. Наколькі гэта для вас складаны крок? Ці наадварот? Што вы маглі б перанесці з адной пасады ў другую?

— Я лічу, што выканаўчая ўлада на сённяшні момант вырашае многія задачы, звязаныя з сацыяльнай палітыкай дзяржавы, што з'яўляецца асноўным і ў рабоце Савета дэпутатаў. Гэта работа з людзьмі, работа з насельніцтвам, прыёмы грамадзян, магчымасць вырашаць тыя праблемы, якія самастойна людзям складана вырашыць. Акрамя таго, неабходна прадстаўляць інтарэсы дзяржавы і даводзіць простымі словамі тыя змены, якія адбываюцца ў краіне, тую палітыку, якую праводзіць дзяржава ўнутры краіны і па-за яе межамі. Людзі павінны адчуваць упэўненасць у заўтрашнім дні.

— Што асабіста для вас прыярытэтна на пасадзе старшыні аблсавета?

— Для мяне такая работа не новая, я з'яўляюся дэпутатам абласнога Савета дэпутатаў з 2018 года. І калі пісала перад выбарамі праграму, рабіла акцэнт менавіта на сацыяльную сферу. Мне дадзеная сфера найбольш вядомая, бо на пасадзе намесніка старшыні Шчучынскага райвыканкама курыравала менавіта гэтыя пытанні. І мне мая выканаўчая ўлада дапамагала рэалізаваць гэтыя задачы.

— Якія асноўныя аспекты былі ў вашым полі зроку?

— Найперш работа з уразлівымі катэгорыямі насельніцтва і работа з моладдзю. Як педагог па адукацыі лічу важным мець кантакт з маладым пакаленнем. Ведаць, як яны ўладкаваліся на новым рабочым месцы, дапамагаць у вырашэнні бытавых праблем. Вельмі важна весці кантроль найменьшай па прадастаўленні льгот і прэферэнцый маладым спецыялістам. У поле зроку знаходзілася і работа з прафсаюзамі. Мы аналізавалі калектыўныя дагаворы і сацыяльную падтрымку на першым рабочым месцы. Моладзь павінна адчуваць падтрымку з боку ўлады і мець магчымасць самарэалізавацца.

— Я ведаю, што вы ў сваім раёне вельмі цесна працавалі з маладымі спецыялістамі. Ці прынесла гэта станоўчыя вынікі?

— З кожным новым спецыялістам даводзілася сустракацца асабіста. Мы праводзілі агульныя сустрэчы, каб пагутарыць па шчырасці, даведацца аб іх мэтах і бачанні сябе ў прафесіі. У сваю чаргу, мною рабілася ўстаноўка на прафесійныя якасці. Малады спецыяліст павінен ведаць, што важна аддаваць сябе той прафесіі, якую абраў. У выніку моладзь аб'ядналася, нават правялі форум маладых спецыялістаў, дзе агучылі тыя задачы, якія хацелі б вырашыць сумесна з раённымі ўладамі. Выраслa замацаванасць маладых спецыялістаў у раёне, напрыклад, у галіне адукацыі — на 10 працэнтаў.

— У вас відавочная стаўка на моладзь. Гэты кірунак захаваецца і на новай пасадзе старшыні аблсавета?

— Лічу, што моладзь — фундамент развіцця любога грамадства. Я нават сказала б, што яна — драйвер развіцця любой тэрыторыі. Калі ідуць паралельна мудрасць, сталасць і маладосць, з'яўляецца новае бачанне развіцця грамадства, яго перспектывы. Таму павінна быць цесная ўзаемасувязь паміж пакаленнямі. Ёсць настаўнікі, якія гатовыя перадаваць свой вопыт.

Між тым, не ўсё, што мы часам прапаноўваем, ім цікава. Скажу шчыра, зразумець маладое пакаленне дапамагалі ўласныя дзеці. Тыя пытанні, якія абмяркоўвалі дома, выносіліся на больш шырокую аўдыторыю. І было відавочна, што мы рухаемся ў адным кірунку.

Важна, каб маладыя людзі разумелі, што ў краіне шмат магчымасцяў, што дзяржава дае нямала гарантый. І трэба ўлічваць, што гэта той патэнцыял, які заўтра будзе забяспечваць эканоміку краіны.

— Магчыма, у дачыненні да моладзі ў вас ёсць планы?

— Ёсць ідэі. Адзін праект з моладдзю мы будзем рэалізоўваць і праз СМІ. Пакуль не буду яго агучваць. Ёсць ідэя па фестывалі маладзёжных ініцыятыў. Такі форум мы правялі ў Шчучынскім раёне, ён меў станоўчыя водгукі. Гэта стымулюе маладзёжныя ініцыятывы, асабліва калі ёсць дзяржаўная падтрымка. Гэта і гранты для маладых з фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. Гэта і субсідыі упраўленняў сацыяльнай абароны для адкрыцця ўласнай справы. Вядома, абласны Савет дэпутатаў не застанецца ў баку ад пошуку ініцыятыўных маладых асоб, лідараў руху. У хуткім часе плануем правесці выязную сесію аблсавета ў Воранаўскім раёне. Будзем абмяркоўваць эфектыўнасць сумеснай работы органаў мясцовага самакіравання і маладзёжнага парламента ў рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі. У канцы жніўня правядзём выязное пасяджэнне прэзідыума аблсавета па тэме здароўя і дэмаграфічнай бяспекі. Наведаем аб'екты аховы здароўя, у тым ліку новыя.

— Як вы расцэньваеце прыняцце новых законаў і ўказаў, у прыватнасці, што датычацца зямельных пытанняў? Наколькі яны актуальныя? Ці можна казаць аб новым стымуле ў развіцці тэрыторый?

— Гаворка ідзе аб новым Кодэксе аб зямлі і Указе «Аб спрошчаным парадку прыёмкі ў эксплуатацыю аб'ектаў будаўніцтва». Гэта значна пашырае паўнамоцтвы выканаўчых і распарадчых органаў улады, дазволіць на месцы прымаць рашэнні па тых праблемах, якія цягнуліся гадамі.

Раней у тых жа сельскіх Саветаў проста не было такіх паўнамоцтваў. І не самыя складаныя пытанні трэба было выносіць на самы высокі ўзровень. Цяпер можна казаць аб спрашчэнні многіх працэдур. Будзе прасцей вырашыць нейкія суседскія спрэчкі аб зямлі, узаконіць даўнія пабудовы, да якіх былі прэтэнзіі па будаўнічых нормах. Ды і будавацца будзе значна прасцей. Магчыма, гэта прыцягне насельніцтва, у тым ліку гараджан, да інвестыцый у жылыя дамы ў сельскай мясцовасці.

— На ваш погляд, ці трэба мяняць падыходы ў рабоце дэпутацкага корпуса, структурных падраздзяленняў, я маю на ўвазе райсаветы, сельскія Саветы?

— Ёсць жаданне павысіць статус мясцовых Саветаў, бо ў іх склад выбіраюцца людзі ініцыятыўныя. Таму будзем шукаць новыя формы ўзаемадзеяння з насельніцтвам. А гэта якраз і можа быць развіццё грамадзянскіх ініцыятыў, якія павінны мець выхад. Пакуль не ўсе дэпутаты могуць працаваць у дадзеным кірунку, праяўляць ініцыятыву, быць завадатарамі спраў. Хацелася б, каб дэпутаты былі актыўнымі карыстальнікамі сацыяльных сетак, каб дзяліліся сваімі ідэямі, былі лідарамі думак, больш выступалі ў сродках масавай інфармацыі, дзяліліся тымі поспехамі, якія ім удалося рэалізаваць, альбо тымі праблемамі, што неабходна абмеркаваць. У тым ліку на старонках газет.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

БЫЦЬ СПАРТЫЎНЫМІ, ТВОРЧЫМІ І ВЕДАЦЬ СВОЙ КРАЙ

Народныя абраннікі Магілёўшчыны прысвяцілі традыцыйную летнюю Спартакіяду Году гістарычнай памяці

СПАБОРНІЦТВЫ праходзілі ў Кіраўску ў мінулыя выхадныя, якраз у тыя дні, калі ў раёне віншавалі першых тысячнікаў — малады экіпаж стрыечных братоў Андрэя і Сяргея Драздоў. Гэта таксама падтрымлівала баявы дух. Адметна, што браты прымалі віншаванні прыкладна ў адзін і той жа час, як і пераможцы сярод дэпутатаў.

Нездарма кажуць, што думкі матэрыяльныя. А калі аб перамозе думае адначасова некалькі чалавек, яна абавязкова здарэцца. На гэты раз у Спартакіядзе брала ўдзел і каманда Маладзёжнага парламента. Больш вопытныя калегі адзначылі, што калі такі пасыл ідзе ад моладзі, то хутка займацца спортам стане модна яшчэ са школы.

— І мы вельмі спадзяёмся, што гэта спраўдзіцца і ў спартыўных секцыях не будзе недахопу ў жадаючых іх наведваць, — падкрэсліў падчас цырымоніі адкрыцця **старшыня пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях, праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанні Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Васіль МАЗУРЫК,** які павітаў удзельнікаў ад імя дэпутацкага корпуса Магілёўскай вобласці. «Спорт — найважнейшы складнік жыцця большасці жыхароў Падняпроўскага краю, у тым ліку і нас, дэпутатаў, — адзначыў ён. — А калі свае спартыўныя здольнасці дэманструюць прадстаўнікі Маладзёжнага парламента, гэта сведчанне таго, што сярод моладзі стала модна быць спартыўнымі і весці здаровы спосаб жыцця. І гэта толькі на карысць усім, бо ўдзел у спартыўных паядынках загартоўвае характар, выхоўвае камандны дух і натхняе на вынік.

Спартыўная эстафета і лёгкая атлетыка, першынство па падцягваннях і скачках на скакалцы, настольны тэніс і шашкі, таварыскі матч па валейболе і конкурс «Трапны футбаліст» — дэпутаты дэманстравалі свае здольнасці па шматлікіх кірунках. Прычым не толькі па спартыўных. Гэтым разам народныя абраннікі паказалі сябе яшчэ і ў якасці артыстаў, ад чаго Спартакіяда толькі выйграла, бо ўдзельнікі падышлі да такой справы не з меншай адказнасцю. Прапрацавалі нумары, знайшлі касцюмы.

Як трапна адзначыў **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір ГАЦКО,** Спартакіяда насамрэч дапамагае ў нефармальнай абстаноўцы лепш даведацца адзін пра аднаго і не толькі рэалізаваць свой спартыўны і творчы патэнцыял, але і сфарміраваць сапраўдную каманду, якая зможа перамагаць на карысць вобласці і нашай любімай краіны і ў рабоце на месцах.

Па выніках спаборніцтваў абсалютным пераможцам у агульнакамандным заліку сталі прадстаўнікі Магілёўскага гарсавета дэпутатаў. На другім месцы — каманда Магілёўскага райсавета і на трэцім — Клічаўскага. А вось у мастацкай самадзейнасці роўных не было камандзе з Кіраўскага раёна. Свята атрымалася цёплым і душэўным. Асаблівасць дэпутацкай Спартакіяды: яна ніколі не праводзіцца ў адным і тым жа месцы, а перамяшчаецца па ўсёй вобласці. Гэта дае ўдзельнікам магчымасць не толькі прадэманстраваць свае спартыўныя здольнасці, але яшчэ і натхніць славутасцямі таго ці іншага раёна. Бо адна з важных задач Спартакіяды — азнаёміцца з турыстычным патэнцыялам Магілёўшчыны і прыкласці намаганні для яго больш шырокага вывучэння і выкарыстання.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў.

ХЛЕБ АБ'ЯДНОЎВАЕ

На Гомельшчыне дэпутаты базавага ўзроўню, замацаваныя за гаспадаркамі, сумесна з прафсаюзамі працягваюць трымаць на кантролі ход уборачнай кампаніі

Старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКА і прафсаюзны лідар Гомельскага раёна Ларыса ЛЕГЛІК упэўненыя, што грамадскі маніторынг — гэта не толькі пра кантроль, але і пра магчымасць шчыра падтрымаць чалавека працы на зямлі.

Старшыня раённага Савета дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКА і прафсаюзны лідар Гомельскага раёна Ларыса ЛЕГЛІК, намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце ААТ «Птушкафабрыка «Свіtанак» Вікторыя ПРЫХОДЗЬКА і галоўны аграном Дзмітрый КАЛУГІН.

Палявая культура бяспекі

На полі гаспадаркі ААТ «Птушкафабрыка «Свіtанак» на ўборцы аўса працуе новы газаматорны камбайн. На момант з'яўлення ў полі дэпутата і прафсаюзнага лідара раёна ідзе працэс запраўкі тэхнікі — набліжацца да машын староннім асобам забаронена. Каб паразмаўляць з камбайнерам, яго памочнікам і кіроўцам, задзейнічаным на адвозцы збожжа, неабходна пачакаць.

— Настроеныя, калі надвор'е не падвядзе, да канца тыдня поўнасцю завяршыць уборку збожжавага каласавога палетка, — кажа **галоўны аграном гаспадаркі Дзмітрый КАЛУГІН**, з якім якраз атрымліваецца пагутарыць, пакуль ідзе запраўка тэхнікі.

Прадпрыемства — у лідарах раёна па тэмпах уборкі. Плануюць закласці ў засекі каля чатырох тысяч тон толькі збожжавых культур.

Па словах намесніка дырэктара па ідэалагічнай рабоце ААТ «Птушкафабрыка «Свіtанак» Вікторыі Прыходзькі, на ўборачнай у гаспадарцы задзейнічана звыш 50 чалавек. Усе яны забяспечаны неабходнай спецвопраткай. Арганізавана работа катлапункта — двухразовы прыём гарачых страў. У спёку работнікаў, якія працуюць у полі і не маюць магчымасці ахаладзіцца, абавязваюць спыняцца на 10-хвілінны дадатковы адпачынак. На такія моманты ў рабоце якраз і звяртае ўвагу старшыня Гомельскага раённага аб'яднання прафсаюзаў Ларыса Леглік.

— За гэты перапынак варта спаласнуць вадой твар, рукі. Абавязкова захоўваць пітны рэжым, — адзначае Ларыса Яўгенаўна. — У гэтай гаспадарцы не зафіксавана парушэнняў па стварэнні ўмоў працы, па захаванні заканадаўства па ахове працы ў перыяд уборачнай кампаніі.

Прафсаюзны лідар уважліва вывучае абстаноўку ў кабіне камбайна:

— Правяраю, ці ёсць у работніка аптэчка, абавязкова кантралюю па спісе, што ў ёй у наяўнасці. Фіксую, як захоўваецца парадак у кабіне. Адзначаю, спраўныя ці не кандыцыянеры, і ўвогуле якая тэмпература ў кабіне. Правяраецца падчас маніторынгу таксама ўстойлівасць крэсла кіроўцы камбайна.

Ларыса Яўгенаўна падкрэслівае, што асабліва ўвага падчас маніторынгу — спецвопратцы і абутку, у якіх выходзяць у рэйс механізатары. Пад строгай забаронай шлёпанцы, любы абутак, які нетрывала фіксуецца на назе. Раённы прафсаюзны лідар адзначае, што гаспадаркі імкнуцца забяспечыць працаўніковў, задзейнічаных на ўборачнай, усім неабходным у гэтым плане. Але, на жаль, сярод некаторых работнікаў яшчэ назіраецца абыякавасць да патрабавання выкарыстоўваць спецвопратку і абутак. Кульгае культура адносін да бяспекі рабочага працэсу.

— Таксама на кантролі як галіновага прафсаюза, так і райаб'яднання — прыманенне ў рэальнасці ўмоў працы, якія прапісаныя ў калектыўных дагаворах, — адзначае Ларыса Леглік.

Старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя Ладуцька дзеліцца сваімі высновамі пасля грамадскага маніторынгу:

— Падчас наведвання сельгасарганізацый раёна, сустрэч з супрацоўнікамі можна ацаніць рабочую атмасферу ў калектыве. Прасачыць, як вядзецца заахвочванне да якаснай работы на месцах, стымуляванне да ініцыятыўнасці ў рабоце, замацаванне маладых кваліфікаваных спецыялістаў.

Праца і дысцыпліна

Наступным аб'ектам маніторынгу дэпутацкага і прафсаюзнага лідараў стала гаспадарка, вядомая не толькі ў раёне, але нават за межамі рэгіёна — ААТ «Сцяг Радзімы». На яе базе цяпер ажыццяўляецца буйны інвестпраект АПК Гомельшчыны — будаўніцтва малочнатаварнай фермы на тысячу галоў дойнага статка.

— «Сцяг Радзімы» — прадпрыемства, у якім не бывае затрымак з выплатай заработнай платы работнікам. Сярэдняя зарплата за першае паўгоддзе сёлета — 1480 рублёў, — адзначае старшыня райсавета дэпутатаў Вікторыя Ладуцька. — Праца і дысцыпліна, працоўная і тэхналагічная — кірункі ў рабоце, абраныя дырэктарам Міхаілам Рубанам. На яго стыль кіраўніцтва раўняюцца многія гаспадаркі рэгіёна.

Не так даўно сельгаспрадпрыемства стала месцам правядзення практыка-арыентаваных заняткаў удзельнікаў праекта Гомельскага аблвыканкама «Школа маладога кіраўніка». Пераймаўся вопыт ААТ «Сцяг Радзімы» выканання ўсіх этапаў палявых работ.

Дарэчы, цяпер падчас уборачнай кампаніі гаспадарка актыўна дапамагае атрымаць першы працоўны вопыт і паспрабаваць свае сілы ў аграгаліне вясковай моладзі. Сёння ў гаспадарцы праз працоўныя дагаворы ўладкавана восем непаўналетніх. На зернетаку якраз рабочая змена сёлетніх выпускніковў Маркавіцкай сярэдняй школы Гомельскага раёна. На змене — Ганна Пятрэнка, Сяргей Мамрукоў і Марыя Крукава. Моладзь з радасцю расказвае дэпутату і прафсаюзнаму лідару раёна аб сваёй першай рабоце і неблагім заробку ў гаспадарцы.

— Працуем па зменах — з 8 да 14 або з 14 да 20 гадзін. Наша задача — сачыць за парадкам, трымаць у належным выглядзе зерняток пасля выгрузкі збожжа, — па-страявому рапартуе моладзь. — Хутка зарплата, на нас аформленыя карткі, куды будуць пераводзіцца грошы, — дзеляцца хлопец і дзяўчаты. Кажуць, за ўвесь час работы па дагаворы плануюць зарабіць не менш за 600 рублёў кожны.

Падобныя маніторынгі гаспадарак — выдатная магчымасць на свае вочы паглядзець, чым жывуць і як працуюць нашы людзі на зямлі, перакананыя старшыня Гомельскага райсавета дэпутатаў Вікторыя Ладуцька і старшыня раённага аб'яднання прафсаюзаў Ларыса Леглік.

— Гэтыя людзі сёння працуюць у тым ліку для забеспячэння сацыяльнай сферы нашага раёна, і аб гэтым не толькі нельга забываць, але варта тое заўсёды адзначаць, — упэўненая Вікторыя Ладуцька. — У перыяд уборачнай кампаніі ніколі не будуць лішнімі словы ўдзячнасці, самая шчырая падтрымка.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

СТАРАСТА БЕЗ «ПАРТФЕЛЯ»

Жыхарка вёскі Гуслянка Магілёўскага раёна лічыць справай гонару дапамагаць людзям

Было, Тамары Іванаўне Панфіловіч прапаноўвалі стаць старастай вёскі. Але адмовілася, не захацела абцяжарваць сябе статусам. Хай пасада і грамадская, але ж усё роўна трэба браць на сябе адказнасць. Яна гатовая дапамагаць іншым, але выключна па сваім жаданні. А гэта не адно і тое ж. Калі ёй нядаўна ўручылі Падзяку ад Магілёўскага райвыканкама, нават разгубілася. За што? Так, неабыякавая, але ж нічога тут звышнатуральнага няма. На вёсцы так заўсёды было. Проста прывыкла жыць па-людску...

Пра Тамару Іванаўну даведалася ад **загадчыка аддзялення першаснага прыёму, аналізу і інфармавання і прагназавання Магілёўскага раённага Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Вольгі ЕРМАКОВАЙ.** Яна патэлефанавала ў рэдакцыю з просьбай напісаць пра валанцёра сярэбранага веку. «Такіх, як наша Тамара Іванаўна, адзінкі, трэба, каб пра іх ведалі. На вёсцы гэта нашы першыя памочнікі. Хоць мы даведваемся пра іх ад трэціх асоб — тых, каму яны дапамагаюць. Гэтыя людзі звычайна вельмі сціплыя, нават пакрыўдзіцца могуць, што ім удзялілі ўвагу. Але ж яны сабе цаны не ведаюць».

Яно і сапраўды крыху дзіўна. Звычайна дапамагаюць пенсіянерам, а тут сама пенсіянерка — сацыяльная дапамога ў адной асобе. Сацработнікаў кранулі перш за ўсё яе шчырасць і дабрыня. Самой ужо крыху за 70, але яна ўзяла на сябе клопат пра амаль 90-гадовага дзядулю. Пенсіянер не можа самастойна сябе абслугоўваць, перамяшчаецца з дапамогай хадункоў, а блізкіх і родных побач няма. Дзядулю хацелі афармліць на сацыяльны ложак, але ён адмовіўся. Маўляў, ёсць памочніца. Яна і ежу прыгатуе, і снег у дварэ зімой пачысціць, і са святамі павіншуе.

— Мы пазнаёміліся з гэтай памочніцай і пераканаліся, што яна чалавек вялікай душы. Жыва рэагуе на чужы боль і заўсёды гатовая падаць руку дапамогі, — расказвае Вольга Ермакова. — Пажылым адзінокім людзям вельмі не хапае ўвагі. Яны нямоглыя, але пакідаць свае родныя хаты і пераязджаць у сацыяльныя ўстановы не жадаюць. І калі знаходзяцца памочнікі, вельмі ўдзячныя ім. Тым больш што наша Тамара Іванаўна робіць гэта бясплатна. Выключна ад шчырага сэрца.

Звычайна на вёсцы праблемамі жыхароў займаецца староста, ён акумулюе пытанні аднавяскоўцаў і даносіць да мясцовай улады. Да яго ідуць па дапамогу, пытаюцца парады. Яны карыстаюцца аўтарытэтам і іх прозвішча ведаюць усе. Тамара Панфіловіч староста, як той казаў, «без партфеля». Яна добра разумее, як цяжка жыць на вёсцы і асабліва адзінокім. Таму нават не чакае, калі яе папросяць дапамагчы. Сама ідзе і пытаецца, чым можа быць карысная.

Сакрэт яе дабрыні просты. Жанчына са шматдзетнай сям'і, і для яе прыкладам на ўсё жыццё сталі бацькі. Івана Максімавіча Сяргейчанку у вёсцы Залессе, дзе жыла іх вялікая сям'я, дагэтуль успамінаюць добрым словам. У 18 гадоў пайшоў на фронт, пад Кёнігсбергам быў цяжка паранены, страціў руку. Пасля вайны пэўны час працаваў старшынёй сельсавета. Заўсёды дапамагаў, чым мог. Маці Ганна Данілаўна таксама была жанчына рэдкай дабрыні. Да яе ўся вёска па парады хадзіла. Лёс яе не быў лёгкім. У вайну шмат гора пабачыла. Немцы здзекаваліся з людзей, прымушалі шукаць міны. Адночы прымусілі ўзяць у рукі вілы і пагналі перад сабой правяраць дарогу. Так і ішлі, пакуль пад нагамі не ўзарваўся замініраваны масток. Ганну кантузіла, але яна засталася жывая. Затое некалькі аднавяскоўцаў літаральна разарвала на часткі. Сярод іх была і цяжарная жанчына. Той жах немагчыма было забыць.

— Нашы бацькі жылі цяжка, шмат працавалі, але заўсёды былі адкрытыя для людзей, заўсёды прыходзілі ім на дапамогу. І яны для мяне прыклад. Я хачу, каб і мяне людзі паважалі, — кажа суразмоўніца.

